КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №7 (135)
◂ 27 ЛЮТАГА ◂ 2009 г.

# Новы Час



**НЕ ПІСЬМЕННІЦА**

Стар.14

**«ЗМОВЫ ПАД КОЎДРАЙ», АБО ПАГРОЗЫ ЕЎРОПЕ**

Расійскае інфармацыйнае агенцтва «РИА Новости» распаўсюдзіла паведамленне, што Еўрапейскі саюз афіцыйна ўключыў Беларусь у праграму «Усходняе партнёрства». Гэтая навіна ўмомант ускалыхнула палітычныя колы Мінска — Стар. 4

**МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ** — Стар. 6

**АЛЬТЭРНАТЫВА БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ**

1 сакавіка ў Краіне Баскаў адбудуцца сапраўды гістарычныя выбары. Упершыню за гісторыю існавання баскскай аўтаноміі да ўлады прыйдуць сацыялісты, якім у цяперашняй сітуацыі проста няма альтэрнатывы. — Стар. 13

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## «Мастак Павел Южык»

Нарыс Сяргея Гваздзёва.

З цыклу «Мастакі Віленскай школы»

ДЫЯЛОГ

# У АБДЫМКАХ ЕЎРОПЫ

Вольга ХВОІН

**За апошні тыдзень Беларусь наведалі шэраг прадстаўнікоў Еўрасаюза. Такога наплыву высокіх гасцей з Захаду краіна «апошняй дыктатуры ў Еўропе» не ведала ўжо шмат гадоў.**



## Візіт 1

Пачалося ўсё з візіту прадстаўнікоў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы на чале са старшынёй Камісіі па палітычных пытаннях Горанам Ліндбладам. Мэтаю візіту былі перамовы па вяртанне Беларусі статуса спецыяльна запрошанага ў ПАРЕ, якога краіна была пазбаўлена пасля непрызнання Еўропай рэферэндуму 1996 года. Цяпер адзінай умовай еўрачыноўнікаў для ўдзелу ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ёсць фарміраванне сумеснай афіцыйна-апазіцыйнай місіі з удзелам дзеючых беларускіх парламентарыяў і прадстаўнікоў апазіцыйнага блока. Пытанне пра вяртанне Беларусі статуса спецыяльна запрошанага будзе разгледжана ў чэрвені.

## Візіт 2

А 19 лютага ў Мінску з вуснаў вярхоўнага прадстаўніка ЕС па пытаннях знешняй палітыкі і бяспекі, генеральнага сакратара Савета ЕС Хаўера Саланы прагучала сцверджанне, што яго візіт у Беларусь — гэта пачатак паляпшэння адносінаў паміж Беларуссю і Еўрасаюзам. Пры гэтым еўракамісар адзначыў, што прыехаў у Беларусь не дзеля таго, каб ставіць умовы.

Сустрэчы, што адбыліся ў межах візіту (з кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Сяргеем Мартынавым, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці — кіраўнікамі Беларускага Хельсінскага камітэта Алегам Гулакам, Беларускай асацыяцыі журналістаў — Жаннай Літвіной, палітыкамі Аляксандрам Казуліным і Аляксандрам Мілінкевічам, юрыстам Аленай Танкачовай і эканамістам Паўлам Данейкам, лідэрам Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандрам Ярашуком), ён расцаніў як «вельмі-вельмі пазітыўныя і канструктыўныя».

Генеральны сакратар ЕС адзначыў, што ў 2009 годзе сярод прыярытэтаў Еўрасаюза — развіццё ініцыятывы «Усходняе партнёрства». «У структуры ініцыятывы асаблівае месца ёсць для Беларусі», — заявіў Хаўер Салана.

У інтэрв'ю БелаПАН палітык сказаў, што ацэньвае свой візіт як «канструктыўны і прадукцыйны». І выказаў упэўненасць, што «працэс нармалізацыі двухбаковых адносінаў пачаўся і будзе працягвацца на добрай хуткасці».

## Візіт 3

Пасля Хаўера Саланы з неафіцыйным бліц-візітам для «збору інфармацыі пра сітуацыю ў Беларусі» ў Мінск прыехала група дэпутатаў Еўрапейскага парламента з фракцыі Еўрапейскай народнай партыі (EPP–ED) на чале з Крыстаферам Бізлі (Вялікабрытанія). Сярод візіцёраў былі Лайма Андрыкене (Літва), якая ініцыявала гэты прыезд дэлегацыі, Яцэк Пратасевіч (Польшча) і Хасэ Хаўер Помез Руіз. (Іспанія)

На працягу шасці гадзін еўрапарламентарыі сустрэліся з прадстаўнікамі Беларускай асацыяцыі журналістаў, пасламі краін ЕС у Беларусі, кіраўніцтвам Галоўнага ўпраўлення Еўропы Міністэрства замежных спраў, палітыкамі Аляксандрам Мілінкевічам, Аляксандрам Казуліным, Паўлам Севярынцам, Вінцуком Вячоркам. Ад сустрэчы з прадстаўнікамі беларускага парламенту еўрапейскія госці ўхіліліся, патлумачыўшы гэта некаторай крыўдай за перашкоды, з якімі сутыкаюцца еўрапейскія палітыкі, калі хочуць наведаць Беларусь. Дарэчы, сярод тых, каму калісьці афіцыйны Мінск адмовіў у выдачы візы, значыцца імя і Лаймы Андрыкене.

Сабраную падчас візіту інфармацыю палітыкі падрыхтуюць для справаздачы Еўрапейскаму парламенту да таго моманту, калі ў сакавіку будзе прымацца рашэнне пра далейшую палітыку ва ўзаемаадносінах паміж ЕС і Беларуссю. Кіраўнік дэлегацыі Крыстафер Бізлі заявіў падчас сустрэчы з журналістамі: «Мы хочам, каб у Беларусі адбыліся змены. Але, калі па-ранейшаму будуць жорстка разганяцца дэманстрацыі, нам будзе вельмі цяжка прыйсці да пагаднення».

На пытанне журналіста «НЧ», ці не маюць заходнія палітыкі намеру прызнаць арыштаваных нядаўна прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенку і Юрыя Лявонава палітычнымі вязнямі і дамагацца іх вызвалення, Крыстафер Бізлі адказаў, што гэта — прэрагатыва праваабарончай арганізацыі «Міжнародная амністыя» і што ўлады тлумачаць іх арышт крымінальнымі прычынамі.

Польскі дэпутат і кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю Яцэк Пратасевіч нагадаў, што рашэнне па Беларусі, якое будзе прымацца Саветам Еўрасаюза, мусіць быць аднагалосным.

«Без усялякіх сумневаў, сёння нельга сказаць, што сярод дваццаці сямі няма краінаў, якія лічаць, што сітуацыя ў Беларусі не змяняецца да лепшага, — падкрэсліў еўрапарламентарый. — Гэта значыць, што голас Еўрапейскага парламента, які будзе прымаць сваю рэзалюцыю перад рашэннем міністраў замежных спраў, будзе вельмі важны. У Беларусі не павінна быць палітычных вязняў, мусяць быць змены ў выбарчым заканадаўстве, якія б прывялі да дэмакратычных выбараў, змены ў крымінальным заканадаўстве — скасаванне шэрагу артыкулаў КК, якія не адпавядаюць міжнароднаму заканадаўству, таксама гэта свабода СМІ, свабода дзейнасці для палітычных партый і няўрадавых арганізацый».

Працяг на стар. 4 ▸

▸ АКЦЫЯ

# СУПРАЦЬ ПРЫМУСОВАГА ПРЫЗЫВУ

**Актывісты аргкамітэта па стварэнні руху «Маладая Беларусь» 23 лютага правялі шэраг акцый супраць прымусовага прызыву ў войска. Гэтыя акцыі былі прымеркаваныя да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.**

Пра гэта БелаПАН паведаміў лідэр аргкамітэта па стварэнні руху Артур Фінькевіч. Паводле яго слоў, актывісты «Маладой Беларусі» вечарам 23 лютага вывесілі некалькі расцяжак у цэнтры Мінска з лозунгам «Ганьба палітычнаму прызыву!».

Як зазначыў Артур Фінькевіч, «Маладая Беларусь» выступае супраць той сістэмы фарміравання войска, якое існуе сёння. «Мы выступаем за прафесійнае войска, служба ў якім будзе ганаровай, а не прымусовай», — сказаў А. Фінькевіч.

«На жаль, сённяшняе войска стала інструментам, які выкарыстоўваюць выключна як рэпрэсіўную машыну супраць маладых актывістаў дэмакратычнага руху. Мы выступаем супраць палітычнага прызыву і супраць такога войска, якое здольнае толькі на тое, каб адлучыць ад грамадскага жыцця дэмакратычных актывістаў», — заявіў А.Фінькевіч.

Як паведаміў малады палітык, пры вывешванні адной з расцяжак быў затрыманы актывіст аргкамітэта Сяргей Клюеў. Яго даставілі ва УУС Ленінскага раёна Мінска, аднак пасля адпусцілі.

▸ АДМОВА

# КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ НЕ БУДЗЕ

**Мінская міжгарнізонная ваенная пракуратура адмовіла ў распачынанні крымінальнай справы па факце збівання Франака Вячоркі пры яго прымусовым прызыве ў армію. Пра гэта БелаПАН паведаміў бацька маладога чалавека, першы намеснік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка.**

В. Вячорка прасіў пракуратуру распачаць крымінальную справу супраць работнікаў ваенкамата Савецкага раёна Мінска і 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра за перавышэнне паўнамоцтваў і прымяненне сілы ў дачыненні да яго сына.

У афіцыйным адказе, паводле слоў палітыка, паведамляецца, што «ваенная пракуратура выдзеліла з праверкі і накіравала згодна з падведамнасцю ў іншыя следчыя органы матэрыялы аб выкарыстанні супраць Франака сілы супрацоўнікамі міліцыі і неўстаноўленымі асобамі ў цывільным адзенні».

Пры гэтым, зазначыў В. Вячорка, экспертыза, праведзеная ў ваеннай часці ў Баранавічах (Брэсцкая вобласць), устанавіла, што ў Франака сапраўды зафіксаваныя пабоі, сляды ад наручнікаў — усяго сем траўм.

«У адказе міжгарнізоннай пракуратуры пацверджана: Франака білі. Ёсць паказанні сведак, што 16 студзеня яго выводзілі з ваеннага шпіталя невядомыя, што 28 студзеня яго везлі ў ваенную часць у наручніках. Што важна — у адказе пракуратуры гаворыцца, што «не выключана», што гэтыя траўмы былі нанесены менавіта 28 студзеня», — падкрэсліў палітык.

В. Вячорка таксама паведаміў, што 26 лютага ў Мінскім гарадскім судзе адбудзецца разгляд касацыйнай скаргі на рашэнне суда Савецкага раёна, які прызнаў Франака прыдатным да ваеннай службы.

▸ ЖЫЦЦЁ

# ЗАРОБКІ ПАДАЮЦЬ

**Налічаная сярэдняя заработная плата ў Беларусі ў студзені 2009 года склала 919 тысяч 637 рублёў, паведаміла прэс-служба Нацыянальнага статыстычнага камітэта. У снежні 2008 года яна складала 1 мільён 187 рублёў.**

Такім чынам, у параўнанні са снежнем зарплата паменшылася на 8,1%, або на 80,6 тысячы рублёў.

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у студзені была 939 тысяч 46 рублёў (у снежні 2008 года — 1 мільён 20 тысяч 299 рублёў).

Рэальная налічаная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені 2009 года ў параўнанні са студзенем 2008 года павялічылася на 5,5%, у параўнанні са снежнем 2008 года паменшылася на 11,7%.

▸ ПРАБЛЕМА

# СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НЕ ХАПАЕ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Гродзеншчына сутыкнулася з вострай праблемай недахопу адукаваных кадраў.**

Найперш не хапае медыкаў і спецыялістаў агракомплексу. Напрыклад, медыцынскіх работнікаў нестае ажно 17 працэнтаў. Заробкі нізкія, і таму выпускнікі медыцынскіх устаноў, пасля таго як адпрацавалі неабходны тэрмін, знаходзяць прыбытковую працу ў іншай галіне дзейнасці і сыходзяць, некаторыя з'язджаюць за мяжу.

Праблемы медыкаў відавочныя, і яны хвалююць улады вобласці, якія дзеля іх вырашэння прапануюць стымуляваць зацікаўленасць дактароў праз вырашэнне іх сацыяльных праблем. Паколькі гэта пытанне на стадыі вырашэння з нявызначаным тэрмінам, то вольныя вакансіі запаўняюць пенсіянеры.

Адсутнасць спецыялістаў у сельскай гаспадарцы вырашаецца іншым чынам.

На пачатку бягучага года Савет міністраў РБ прыняў пастанову, якая прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў у гэтым накірунку. Стандартны набор абяцанак савецкіх часоў: павысіць сялянам заробак, палепшыць забеспячэнне жыллём, увесці новыя катэгорыі працаўнікоў гэтай галіны і г. д.

У адпаведнасці з пастановай, мяркуецца разгледзіць пытанне паступлення выпускнікоў ПТВ у ВНУ на скарочаны тэрмін, абітурыентаў з сельскай мясцовасці прымаць па асобным конкурсе, аднак тэрмін іх апрацоўкі павялічыць да 5 гадоў.

▸ СМІ

# З ІНШАЗЕМЦАМІ НЕ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ!

**Сябар Беларускай асацыяцыі журналістаў Таццяна Бублікава 24 лютага была выклікана ў пракуратуру Гомельскай вобласці, дзе яе папярэдзілі аб недапушчальнасці супрацоўніцтва з замежнымі СМІ без акрэдытацыі ў адпаведнасці з ч. 4 арт. 35 новага закона аб СМІ.**

Як паведаміла БелаПАН Таццяна Бублікава, у пракуратуры ёй патлумачылі, што двое грамадзянін звярнуліся з просьбай правесці праверкі ў дачыненні да журналісткі, якая нібыта супрацоўнічае з польскім спадарожнікавым тэлеканалам «Белсат».

Бублікавай былі прад'яўлены раздрукоўкі з сайта тэлеканала «Белсат» за 22 лістапада 2008 года. У адным з матэрыялаў маецца каментарый дырэктара Гомельскага драматычнага тэатра Валянціны Маісеенкі аб фестывалі, што праводзіўся ў горадзе. Дырэктар драмтэатра, паводле слоў работнікаў пракуратуры, што звярнулася з заявай, што яна давала каментарый Бублікавай, якая не папярэдзіла яе пра тое, што матэрыял з'явіцца ў польскіх СМІ.

У пракуратуры журналістцы паказалі таксама адказ на запыт у МЗС Беларусі, дзе гаворыцца, што тэлеканал «Белсат» на тэрыторыі краіны не зарэгістраваны. Адказ з МЗС быў атрыманы 19 студзеня. «Цікава, што заявы ад абураных грамадзян прыйшлі ў пракуратуру 28 студзеня, але яшчэ 19 студзеня быў атрыманы адказ з МЗС, а раздрукоўкі з сайта «Белсат» былі ў пракуратуры яшчэ 2 снежня. Атрымліваецца, што яны загадзя праводзілі праверку, і толькі затым прыйшлі заявы ад грамадзян», — зазначыла Т. Бублікава.

Яна падкрэсліла, што на тэрыторыі Беларусі не ажыццяўляе журналісцкую дзейнасць ад імя тэлеканала «Белсат», журналістам працуе з 2002 года, супрацоўнічае з рознымі выданнямі.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# УТРЫМАНЫЯ ГРОШЫ ВЯРНУЦЬ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Паводле праверкі, праведзенай Гродзенскім абласным упраўленнем Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, выпісана прадпісанне пералічыць заробак работнікам ААТ «Мастоўдрэў» за перыяд з 10 лістапада па 24 снежня 2008 года, а таксама налічыць заработную плату за час прастою з 25 снежня па 11 студзеня 2009 года. Адпаведныя сумы павінны быць выплачаны работнікам ААТ «Мастоўдрэў» да 17 сакавіка 2009 года. Праверка была праведзена ў адпаведнасці з дэпутацкім запытам Дзмітрыя Кухлея, да якога звярнуліся рабочыя з просьбай абараніць іх працоўныя правы.**

Сярод прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны Беларусі найбольш за ўсіх ад крызісу пацярпела ААТ «Мастоўдрэў», якое згубіла большасць сваіх кліентаў і рынкаў збыту. Гэта запатрабавала ад кіраўніцтва прадпрыемства прыняцця адпаведных антыкрызісных мер: зніжэння сабекошту прадукцыі, выпрацоўкі адпаведнай маркетынгавай палітыкі, новых падыходаў у кіраўніцтве прадпрыемства.

Аднак замест гэтага было прынята рашэнне перакласці ўвесь цяжар сітуацыі на плечы працоўных: былі значна зменшаны заробкі і некаторыя іншыя даплаты, скарочаны адпачынкі. Логіка адміністрацыі зразумелая, таварыства — адзінае буйное прадпрыемства на Мастоўшчыне, працоўных рук у раёне лішак, расце беспрацоўе, таму людзі гатовыя працаваць за грашы. На самім ААТ абаранціць працоўных (а іх каля 2600 чалавек) няма каму: афіцыйны прафсаюз



Photo.ByMedia.Net

падпісвае любыя паперкі, якія яму падсоўвае кіраўніцтва.

Як выявіла праверка, у мінулым годзе, у парушэнне заканадаўства, усім служачым і рабочым была ўстаноўлена аплата працы ў памеры двух трэціх месячнага акладу. Пасля праверкі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мастоўскага райвыканкама, рабочым таварыства 28 снежня былі ажыццёўлены выплаты на суму 258,359 мільёна руб. Аднак выплаты не былі зроблены служачым. Зараз гэта павінна быць здзейснена да 17 сакавіка.

Акрамя таго з 25 снежня 2008 года па 11 студзеня 2009 года, згодна з загадам гендырэктара Асосава, праца ўсіх структурных падраздзяленняў была прыпынена ў сувязі з адсутнасцю абаротных сродкаў, наяўнасцю на складах вялікіх запасаў гатовай прадукцыі, Раством і Навагоднімі святамі. У гэтым выпадку наймальнік павінен быў, у адпаведнасці з заканадаўствам, аплаціць работнікам прастой у памеры не меней за дзве трэці тарыфнай стаўкі, што не было зроблена.

Аднак зараз кіраўніцтву прадпрыемства давядзецца раскашэліцца.

ФОРУМ

# НА ФЭСТ НДА — ПРАЗ КДБ

Марыя КРУК

**У працы рэспубліканскага форуму — Асамблеі няўрадавых арганізацый, якая адбудзецца 6–7 сакавіка ў Мінску ў Міжнародным адукацыйным цэнтры, возьмуць удзел больш за 250 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і ініцыятыў, запрашэнні накіраваныя блізу пяцідзесяці прадстаўнікам партнёрскіх арганізацый з-за мяжы.**



Грамадскія дзеячы Ірына Жыхар, Сяргей Мацкевіч, Алёна Валынец, Вацлаў Арэшка

Арганізатары форуму паведамілі, што двум запрошаным замежнікам адмоўлена ва ўездзе ў Беларусь. Гэта Дэвід Гамільтан — кіраўнік Нацыянальнага дэмакратычнага інстытута ва Украіне і Агнешка Камароўска — прадстаўніца фонду імя Стэфана Баторыя ў Варшаве. Дэвіду Гамільтану ў пасольстве паведамілі, што ён неўязны ў Беларусь, але калі яго вельмі хочуць бачыць на форуме, то за дазволам трэба звярнуцца ў КДБ, які разгледзіць заяву і прыме рашэнне.

Да ўдзелу ў форуме запрошаныя не толькі сябры зарэгістраваных у краіне грамадскіх аб'яднанняў, але і прадстаўнікі незарэгістраваных ініцыятыў. «У Беларусі не зарэгістравана прыблізна палова ініцыятыў грамадзян, — адзначыў сябра аргкамітэту Асамблеі Сяргей Мацкевіч. — Усяго зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў менш за тры тысячы, што для нашай краіны вельмі малы паказчык». Сярод найбольш вядомых арганізацый, якія запрошаныя да ўдзелу ў форуме, — рух «За свабоду», Беларускі Хельсінскі камітэт, праваабарончы цэнтр «Вясна», Беларуская арганізацыя працоўных жанчын ды іншыя.

У праграме шостай па ліку Асамблеі — фэст-прэзентацыя арганізацый трэцяга сектару Беларусі, паседжанне секцый па пытаннях стратэгіі і развіцця няўрадавых арганізацый, дачыненнях з міжнароднай супольнасцю, уладамі (на гэтую секцыю запрошаны прадстаўнік ад Адміністрацыі прэзідэнта). Таксама запланаваны «круглыя сталы» па экалагічных пытаннях, медыйным забеспячэнні працы НДА ды іншае. Па выніках Асамблеі будзе прынятая рэзалюцыя, якую распаўсюдзяць сярод недзяржаўных арганізацый, а таксама органаў улады.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗАБРАЦЬ ДЫ ПАДЗЯЛІЦЬ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Нешта не тое робіцца ў нашым «каралеўстве». З рэвалюцыйнай заявай выступіў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Адзінае шкада: што ўсё гэта ў духу спадара Шарыкава. Таго самага, які «Паліграф Паліграфавіч», — «Забраць ды падзяліць!».**




Photo.ByMedia.Net

«Калі бізнесмены на працягу першага квартала не рэалізуюць ужо пабудаванае жыллё, то мы яго забяром і прададзім маючым патрэбу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка ў ходзе наведвання Мінскага маторнага завода 24 лютага.

«Я бачу, што ўжо пабудаваныя дамы не здаюцца ў эксплуатацыю, — зазначыў А. Лукашэнка. — Што адбываецца? Насельніцтва чакае танных крэдытаў, каб набыць гэта жыллё, пажадана пад 5–7%. Бізнесмены ж стаіліся, думаюць, што дзяржава цяпер укіне пэўную колькасць грошай, і яны зноў па 2–3 тысячы доляраў за квадратны метр будуць прадаваць. Гэтага не будзе». А. Лукашэнка паставіў задачу да канца першага квартала рэалізаваць усё пабудаванае жыллё па цане, блізкай да сабекошту. «Добра, калі яны прададуць па сабекошту», — адзначыў ён.

Нічым іншым, як рэвалюцыйнай ідэалогіяй, патлумачыць гэта немагчыма. «Бізнесмены ж прытаіліся», — трэба іх раскулачыць. «Мы яго адбяром», — гэта ўвогуле не лезе ні ў якія вароты. На падставе чаго адбяром? Па рашэнні суда? На падставе чаго суд прыме такое рашэнне? «Прададуць па сабекошту»? Хто будзе вызначаць гэты «сабекошт»? Ці не тыя бізнесмены, якія «прытаіліся»?

Услед за Аляксандрам Лукашэнкам выступіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка. Паводле яго слоў, вядучым айчынным аператарам сотавай сувязі — МТС і Velcom — прапанавана перагледзець свае пазіцыі па павышэнні тарыфаў на 18 працэнтаў і вярнуцца да ранейшых тарыфаў. «Калі гэта не будзе зроблена, то Міністэрства эканомікі як антыманапольны орган будзе вымушана прымяніць дзяржаўнае рэгуляванне, гэта значыць уключыць гэтых аператараў у пералік манапалістаў», — заявіў кіраўнік эканамічнага ведамства.

Спадару Зайчанку трэба быць больш стрыманым у сваіх выказваннях. Інакш яго заваляць скаргамі. Калі «Міністэрства эканомікі як антыманапольны орган», то менавіта ад Міністэрства эканомікі трэба патрабаваць распаўсюду нашай улюбёнай газеты «Новы час». Чаму яе не распаўсюджваюць манапалісты «Белсаюздрук» і «Белпошта»? Давайце, спадар Зайчанка стане паштальёнам і будзе разносіць «Новы час» усім зацікаўленым асобам!

А калі сур'ёзна — то выказванне спадара Зайчанкі сведчыць, што аніякай рынкавай эканомікі ў Беларусі няма. «Антыманапольны орган», які ўказвае, што рабіць дзвюм (!) кампаніям... Выбачайце, дзве — не манапалізм. «Дзяржаўнае рэгуляванне» сотавых аператараў, адзін з якіх амаль напалову (49%) належыць Расіі (МТС), а другі — Аўстрыі (кантрольны пакет акцый «Velcom», які належаў дзяржаве, быў прададзены ў жніўні 2007 года другому саўладальніку кампаніі — «SB Telecom» (Кіпр). У кастрычніку таго ж года аўстрыйская кампанія «Telekom Austria Group» набыла 70% акцый «SB Telecom»), — ні ў якія межы не кладзецца.

Больш за тое: нішто проста так з неба не падае. За базавыя станцыі, за роўмінг, за замежныя паслугі мабільныя аператары плацяць грошы. І не ў рублях, а ў замежнай валюце. Таму яны папросту самі вымушаны падымаць кошты рублёвыя, каб набыць за гэтыя рублі валюту і потым разлічыцца са сваімі партнёрамі.

Канешне, ёсць і прапанова. Каб мабільныя аператары не павышалі б кошты на 18%, давайце «адкруцім назад» дэвальвацыю беларускага рубля напачатку Новага года. Бо менавіта з-за дэвальвацыі ўзнялі кошт мабільныя аператары. Фінансавая палітыка павінна быць у юрысдыкцыі Міністэрства эканомікі, ці не так, спадар Зайчанка?

Не, я не супраць, каб сувязь патаннела. Але я ведаю, што нічога ў жыцці бясплатна не бывае. Яшчэ ў школе мяне навучылі, што ёсць такі закон: закон захавання матэрыі і энергіі. І калі нешта недзе знікла, — значыць, нешта недзе з'явілася. Калі мы плацім за сувязь — з'яўляюцца новыя базавыя станцыі, паляпшаецца якасць абслугоўвання. Калі нехта будуе жыллё — яму трэба цэгла і бетон. А цэгла і бетон — таксама не задарма.

А вось у каго варта «адабраць ды падзяліць», — гэта ў сапраўдных манапалістаў. Вядома, што адзіны першасны правайдэр па прадстаўленні паслуг інтэрнэту — «Белтэлекам». Беларускія блогеры параўналі тарыфы еўрапейскіх правайдэраў з «Белтэлекамам». Беларусы ў параўнанні з Польшчай плацяць за інтэрнэт больш у 70 разоў! А калі параўноўваць з Расіяй або з Англіяй... «Лепш не параўноўваць, дзеля захавання душэўнага спакою», — раяць блогеры.

Гэта прытым, што нармальнага параўнання... не атрымалася! Бо еўрапейскія правайдэры прадстаўляюць хуткасць падлучэння да 10 Мбіт у секунду, а «Белтэлекам» — не больш за 1 Мбіт/с.

І ледзь-ледзь Беларусь не трапіла ў Еўропу. Гэта той выпадак, пра які кажуць «а шчасце было так магчыма, і так магчыма, і вось так»… У паведамленні «*РИА Новости*» пра тое, што 23 лютага ў Брусэлі міністры замежных спраў ЕС прынялі рашэнне пра сяброўства Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства», была звычайная памылка. «Еўрасаюз пакуль не прыняў канчатковага рашэння пра ўключэнне Беларусі ў праграму «Усходняе партнёрства», — паведаміў Ян Сліва, прэс-сакратар пастаяннага прадстаўніцтва Чэхіі, якая старшынствуе ў ЕС. — Рашэнне будзе прынятае прыкладна ў сакавіку».

У выніковым дакуменце аб пасяджэнні кіраўнікоў МЗС краін ЕС, што прайшло 23 лютага ў Брусэлі, указваецца, што міністры абмяркавалі «падрыхтоўку да прыняцця» ініцыятывы «Усходняе партнёрства». Чакаецца, што ў сакавіку новую палітыку ўхваляць кіраўнікі ЕС. Установчы саміт «Усходняга партнёрства» пройдзе 7 мая ў Празе. Да ўдзелу ў праграме «Усходняе партнёрства» запрошаныя шэсць постсавецкіх краін — Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна. Удзел Беларусі пакуль пад пытаннем.

ДЫЯЛОГ

# У АБДЫМКАХ ЕЎРОПЫ

◂ Працяг.
Пачатак на стар. 1.

Дэпутатка Лайма Андрыкене звярнула ўвагу на сітуацыю са свабодай СМІ: «Вельмі добра, што дзве газеты вярнуліся ў сістэму падпіскі і распаўсюду. Але ў нас яшчэ ёсць доўгі спіс выданняў, якія не ўключаныя ў сістэму распаўсюду. Гэта «Новы час», «Барысаўскія навіны», «Віцебскі кур'ер» ды іншыя». Еўрадэпутаты ў сваіх ацэнках былі ўсё ж больш цвёрдымі, у параўнанні з чыноўнікамі ЕС, якія наведалі Беларусь да іх. «Супрацоўніцтва павінна засноўвацца на павазе да пэўных прынцыпаў. Мы выказваем добрую волю, але мы павінны быць упэўненыя, што гэта добрая воля сыходзіць не толькі ад Еўропы, але і ад Беларусі», — заявіў Яцэк Пратасевіч.




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Дэпутаты Еўрапарламента: Лайма Андрыкене, Крыстафер Бізлі, Яцэк Пратасевіч

## Візіты 4 і 5

Не толькі Брусель, але і бліжэйшыя суседзі разгарнулі ў Мінску сваю знешнепалітычную дзейнасць. Беларусь наведаў ужо былы прэм'ер-міністр Латвіі Іварс Гадманіс. Вынікам яго сустрэчы з Сяргеем Сідорскім і прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнка стала падпісанне мемарандума ў сферы энергетыкі. «Беларусь, Літва і Латвія плануюць у найбліжэйшы час прапанаваць ЕС сумесны энергетычны праект», — заявіў журналістам па выніках перамоў Сідорскі.

Гандлёвы абмен і эканамічнае супрацоўніцтва паміж Польшчай і Мінскам — галоўныя тэмы візіту міністра польскай эканомікі Вальдэмара Паўляка ў Беларусь. Віцэ-прэм'ера Польшчы суправаджалі віцэ-міністры эканомікі, сельскай гаспадаркі і фінансаў. Віцэ-прэм'ер Паўляк сустрэўся з беларускім віцэ-прэм'ерам Андрэем Кабяковым. Вальдэмар Паўляк заявіў, што надышоў момант эканамічна адкрыцца для Беларусі.

## Што далей

23 лютага ў Брусэлі адбылося пасяджэнне Савета Еўрасаюза з удзелам міністраў замежных спраў 27 краінаў блоку. На ім абмяркоўваўся будучы старт «Усходняга партнёрства», якім Еўрасаюз хоча паглыбіць адносіны са сваімі ўсходнімі суседзямі.

Як зазначаюць у Брусэлі, «Еўрасаюз хацеў бы, каб Беларусь удзельнічала ў гэтай праграме, аднак глыбіня гэтага ўдзелу будзе залежаць ад агульнага стану адносін Саюза і Беларусі, якія будуюцца, у прыватнасці, на базе істотнага прагрэсу ў галіне дэмакратызацыі, законнасці і выканання правоў чалавека ў Беларусі».

Кіраўнік знешняй палітыкі Еўрасаюза Хаўер Салана пасля візіту ў Беларусь выказаўся за паглыбленне адносін з Мінскам. Міністр замежных спраў Нямеччыны Франк Вальтэр Штайнмаер, які нядаўна сустракаўся з Сяргеем Мартынавым, заявіў, што падтрымлівае ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняга партнёрства».

Пазіцыя вышэйшага кіраўніцтва Еўрасаюза паказвае, што яно не адмаўляецца ад сваіх раней высунутых дванаццаці ўмоў, але і не патрабуе іх неадкладнага выканання, вылучыўшы з іх пяць найбольш важных, аднак, зноў жа, не як абавязковых папярэдніх, а для пакрокавай, паступовай рэалізацыі.

Зразумела, што палітыкі і эксперты ЕС, тым больш пасля іх непасрэднага азнаямлення з сітуацыяй у Беларусі, ведаюць і пра разгоны вулічных акцый, і пра новыя палітычна матываваныя арышты, і пра сітуацыю са свабодай СМІ. Відавочна таксама, што ў краін ЕС, у палітыкаў пакуль няма адзінай пазіцыі, якую і імкнуцца выпрацаваць. Аднак відавочна і тое, што цяпер у якасці прыярытэтнай ім бачыцца задача далучыць Беларусь да Еўропы. Што эканамічныя інтарэсы бяруць верх. Што разгорнутая палітыка па ўцягванні Беларусі ў стасункі з ЕС — асэнсаваная і прадуманая. Што палітыка дыялогу і супрацоўніцтва ўяўляецца ім больш дзейсным рычагом для таго, каб у Беларусі пайшлі далейшыя перамены, у тым ліку і ў палітычнай сферы, чым папярэдняя палітыка ізаляцыі.

На фоне афіцыйных перамоў паміж ЕС і Беларуссю апазіцыя імкнецца знайсці сваё месца ў дыялогу і не застацца за бортам збліжэння з Еўропай, хаця Аляксандр Лукашэнка перыядычна ў сваіх спічах нагадвае, што пасярэднікаў бачыць не жадае. Палітыкі з апазіцыйнага блока ў цэлым заяўляюць, што ўхваляюць дыялог з Еўропай. Але з абавязковым выкананнем раней акрэсленых умоў аб зменах у сістэме палітычных і грамадзянскіх правоў.

ПАРТНЁРСТВА

# «ЗМОВЫ ПАД КОЎДРАЙ», АБО ПАГРОЗЫ ЕЎРОПЕ

Вольга ХВОІН

**Расійскае інфармацыйнае агенцтва «*РИА Новости*» 24 лютага распаўсюдзіла паведамленне, што Еўрапейскі саюз афіцыйна ўключыў Беларусь у праграму «Усходняе партнёрства». Гэтая навіна ўмомант ускалыхнула палітычныя колы Мінска. Пасля стала вядома, што расійскі журналіст памыліўся. Але палітыкі з апазіцыйнага стану тэрмінова выступілі з заявамі наконт магчымага ўключэння нашай краіны ў гэтую праграму, адзначыўшы, што калі чуткі з'яўляюцца, значыць гэта каму-небудзь патрэбна.**

Асноўны пасыл заключаўся ў тым, што ўдзел у еўрапейскіх праектах немагчымы без выканання беларускімі ўладамі раней акрэсленых патрабаванняў змяніць сітуацыю з выкананнем правоў і свабод чалавека ў дзяржаве. Цяпер стаіць пытанне, ці будзе запрошаны Аляксандр Лукашэнка на вясновы саміт «Усходняга партнёрства» ў Празе, што можа стаць паваротнай кропкаю ва ўзаемаадносінах паміж ЕС і Беларуссю.



Фота Юліі Дарашкевіч

Хаўер Салана вітаецца з Аляксандрам Казуліным

**Даведка:**

Ідэя стварэння праграмы «Усходняе партнёрства» ўпершыню прагучала летась у Брусэлі. Яе ініцыятарамі лічацца Польшча і Швецыя. Гэта праграма, якая ажыццяўляецца і фінансуецца ў межах еўрапейскай палітыкі добрасуседства, першапачаткова адрасавалася для Украіны, Малдовы, Грузіі, Арменіі і Азербайджану. Потым было прапанавана пашырыць яе і на Беларусь.

Праграма мусіць садзейнічаць «палітычнаму збліжэнню» ЕС з краінамі —удзельніцамі праграмы, іх эканамічнай інтэграцыі. Еўрасаюз мае намер актыўна садзейнічаць правядзенню ў гэтых краінах рэформаў, накіраваных на развіццё дэмакратыі і рынкавых адносін. Не ўсе краіны ЕС вітаюць праграму супрацы з постсавецкімі краінамі. Партугалія, Францыя, Іспанія ўспрымаюць праграму «Усходняе партнёрства» як канкурэнцыю Міжземнаморскаму саюзу, які быў створаны пад патранатам Францыі для развіцця адносін з краінамі міжземнаморскага басейна.

Стартавы ўзровень фінансавання праграмы склаў каля 450 мільёнаў еўра, да 2013 года Еўракамісія мае намер падняць яго да 785 мільёнаў.

Старшыня партыі БНФ Лявон Баршчэўскі звярнуў увагу, на якім фоне адбываецца прыняцце рашэння аб далучэнні Беларусі да праграмы «Усходняе партнёрства» — з'яўленне новых палітычных зняволеных, разгоны акцый і затрыманні, візіт еўрапейскіх чыноўнікаў без агучвання мэтаў і вынікаў (маецца на ўвазе візіт генсекса ЕС Хаўера Саланы).

«Нам прапануюць заплюшчыць вочы на рэпрэсіі і прыняць менавіта рэжым Лукашэнкі і даць яму магчымасць нароўні прадстаўляць сваю краіну з кіраўнікамі іншых краінаў, — адзначыў каардынатар «Хартыі–97» Андрэй Саннікаў. — Калісьці мы папярэджвалі сваіх сяброў з Расіі пра магчымую «лукашызацыю» іх дзяржавы. Гэта адбылося. Цяпер такая пагроза існуе для Еўропы. Мы павінны ведаць і ўсведамляць, якую пагрозу нясуць гульні з апошнім дыктатарскім рэжымам Еўропы.

Былы старшыня Вярхоўнага савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч параўноўвае цяперашнія міжнародныя перамовы са «змоваю пад коўдрай», калі кожны пераследуе ўласныя інтарэсы. «Чаму менавіта цяпер забываюцца на высунутыя раней умовы? Ні адна з іх не была выканана. Адных палітвязняў памянялі на другіх. Можа, больш вядомы быў рэктар і кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, але цяпер таксама людзі сядзяць у турме за палітычную дзейнасць — няма ніякага сумневу ў гэтым. Ёсць іншыя прыклады палітычнага пераследу за пэўнае стаўленне да рэжыму. Чаму Салана кажа, што ўмоў больш няма? Адказ, мне здаецца, відавочны. Восенню павінны адбыцца выбары ў Еўрапарламент, новаабраныя дэпутаты зробяць пэўныператрус у выканаўчай уладзе. Кіраўніцтва ЕС і Лукашэнка маюць аднолькавыя мэты — яны хочуць застацца пры ўладзе. Яны хочуць паказаць, што ў міжнародных справах, у адносінах з Беларуссю ёсць вялікія дасягненні. Імкнуцца дапамагчы Лукашэнку даказаць, што ў Беларусі адбыліся змены рэжыму, што ён робіцца больш дэмакратычным. Не можа быць палітыка амаральнай, як бы ні хацелася застацца пры гэтых пасадах», — пакрэсліў С. Шушкевіч.

Былы палітвязень Аляксандр Казулін таксама выступіў з заявай, нагадаўшы, што ўсе чакаюць ад кіраўніцтва краіны інстытуцыянальных пераменаў, а ад візіту Саланы — далучэння Беларусі да фундаментальных каштоўнасцяў, правоў і свабодаў, па якіх «грамадзяне краіны ўжо засумавалі». «Нам хацелася б, каб еўрапейскія каштоўнасці ў самым высокім разуменні гэтага слова прыходзілі ў нашу краіну. І тыя дзеянні, што адбываюцца, былі ў дапамогу Беларусі, яе грамадзянам, а не ў дапамогу дзеючаму палітычнаму рэжыму», — падкрэсліў палітык.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Прэс-канферэнцыя актывістаў стварaемай БХД. У цэнтры – Аляксей Шэін, Павел Севярынец, Віталь Рымашэўскі

# ХАДЭКІ РАЗВІТАЮЦЦА З ЗІМОЮ ЎСТАНОЎЧЫМ З'ЕЗДАМ

Вольга ХВОІН

**28 лютага ў Мінску адбудзецца ўстаноўчы з'езд партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя». Шматпартыйная сістэма краіны, магчыма, папоўніцца яшчэ адной палітычнай структурай.**



Заснавальнікамі партыі з'яўляюцца 1057 чалавек, гэты спіс і будзе падавацца ў Міністэрства юстыцыі на рэгістрацыю. Агулам у базе прыхільнікаў партыі — каля дзвюх тысяч асобаў. У працы з'езда будуць удзельнічаць 211 чалавек. На дадзены момант сустаршынямі арганізацыйнага камітэту партыі БХД з'яўляюцца Мікалай Арцюхоў, Георгій Дзмітрук, Віталь Рымашэўскі, Павал Севярынец, Аляксей Шэін. Статутныя дакументы прадугледжваюць не толькі сустаршынства ў кіраўніцтве партыі, але і аднаасобнае старшынства. Магчыма, у далейшым будзе абраны апошні варыянт, праўда, з абмежаваннем па кадэнцыі на два тэрміны.

На ўстаноўчы з'езд партыі былі запрошаныя кіраўнікі хрысціянска-дэмакратычных партый Галандыі, Фінляндыі, Вялікабрытаніі, Нарвегіі, Літвы, Украіны. З хадэкамі трох апошніх краінаў Беларуская хрысціянская дэмакратыя мае падпісаныя пагадненні пра супрацоўніцтва. Таксама на з'езд запрошаныя кіраўнікі пасольстваў еўрапейскіх краінаў, беларускія палітыкі — Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін, Мікола Статкевіч, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька, Зміцер Дашкевіч, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Акрамя вырашэння арганізацыйных пытанняў, на з'ездзе будзе вызначаны кандыдат у прэзідэнты ад БХД. Цяпер вядома, што ёсць тры кандыдатуры. Адзін з іх — сустаршыня аргкамітэту па стварэнню партыі Віталь Рымашэўскі. 1 сакавіка адбудзецца міжнародная канферэнцыя БХД, у якой прымуць удзел госці з замежжа, што прыехалі на ўстаноўчы з'езд.

У незалежнасці ад таго, ці будзе зарэгістравана партыя, актывісты БХД працягнуць працаваць над кампаніямі «За сямейныя каштоўнасці», «Люблю Беларусь», пакаяння за злачынствы камунізму, супраць магіі і акультызму, кампаніяй аб свабодзе сумлення. Акрамя таго, хрысціянскія дэмакраты плануюць распрацаваць свой антыкрызісны план для эканомікі краіны.

Сустаршыня арганізацыйнага камітэту партыі БХД Павел Севярынец заявіў, што партыя ставіць на мэце мабілізаваць правацэнтрысцкія палітычныя сілы краіны. Супраца будзе весціся найперш з партыямі БНФ, АГП, рухам «За свабоду», моладзевай арганізацыяй «Малады Фронт». «Мы ствараем партыю, якая мусіць стаць мацнейшай палітычнай сілай краіны», — падкрэсліў Севярынец.

Арганізацыйная праца па стварэнню партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» пачалася ў 2005 годзе. За гэты час аргкамітэт не толькі назбіраў неабходную колькасць прыхільнікаў, але і правёў шэраг грамадскіх і палітычных кампаній. На дадзены момант хрысціянскія дэмакраты надзвычай актыўныя, безумоўным плюсам з'яўляецца тое, што ў палітыку за адносна кароткі тэрмін атрымалася прыцягнуць многа новых людзей.

Разам з тым, паводле сацыялагічнага апытання, якое правялі даследчыкі інстытуту Gallup, Беларусь — адна з адзінаццаці найменш рэлігійных краінаў свету. Толькі 27 працэнтаў жыхароў краіны адказалі, што рэлігія ў іх штодзённым жыцці займае важнае месца. Даследаванне праводзілася ў 143 краінах. Найбольш рэлігійнымі выявіліся Егіпет, Бангладэш, Шры Ланка і Інданезія. Вялікую ролю рэлігія займае ў жыцці жыхароў Італіі, Партугаліі, Польшчы, Румыніі, Грэцыі, а таксама ЗША. Сярод найменш рэлігійных — Эстонія, Азербайджан, Ганконг, Японія, Манголія і Беларусь.

Сустаршыня аргкамітэта Віталь Рымашэўскі лічыць, што БХД — гэта партыя для веруючых і няверуючых, але найперш для людзей, якія паважаюць агульначалавечыя каштоўнасці. Павел Севярынец увогуле перакананы, што праграму БХД могуць падтрымаць каля 80 працэнтаў жыхароў Беларусі. Натуральна, усе палітычныя апазіцыйныя плыні цяпер знаходзяцца ў кепскіх умовах: камунікацыя з насельніцтвам зведзеная да тыпу тэт-а-тэт, доступ да дзяржаўных СМІ забаронены. Але, калі каманда заснавальнікаў партыі будзе працягваць працаваць у такім жа тэмпе, то можа скласці канкурэнцыю старажылам палітычнага поля. Між іншым, сярэдні ўзрост сябраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі — 35,6 года, што вызначае яе як найперш партыю маладых палітыкаў. «Але будзем імкнуцца, каб было 36,6», — жартам паабяцаў Павел Севярынец.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# МІХАІЛ ПАШКЕВІЧ — НОВЫ СТАРШЫНЯ «МАЛАДЫХ ДЭМАКРАТАЎ»

Вольга ХВОІН

**Новым старшынёй моладзевай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі «Маладыя дэмакраты» на безальтэрнатыўнай аснове абраны Міхаіл Пашкевіч.**

Такое рашэнне прыняла большасць дэлегатаў (38 з 44-х) з усіх абласцей краіны (акрамя Віцебскай і Магілёўскай, дзе арганізацыйныя структуры пакуль не сфарміраваліся) другой справаздачна-выбарчай канферэнцыі арганізацыі. Іншыя кандыдаты на старшынства — Аляксандр Сергіенка і Уладзімір Вуяк добраахвотна знялі свае кандыдатуры. Намеснікам старшыні арганізацыі абраны Аляксандр Сергіенка. Міхаіл Пашкевіч апошні год фактычна з'яўляўся негалосным лідэрам «Маладых дэмакратаў». Да яго арганізацыю ўзначальваў Аляксандр Шумкевіч. Ён жа напярэдадні з'езду распаўсюдзіў інфармацыю, што моладзевая арганізацыя АГП спыняе супрацоўніцтва з партыяй. «Моладзевы хрысціянска-сацыяльны саюз» пад кіраўніцтвам Шумкевіча правёў свой альтэрнатыўны з'езд, на якім прысутнічалі 57 чалавек.

Як паведаміў кіраўнік створанай арганізацыі, яе сябрамі цяпер з'яўляюцца менавіта дэлегаты з'езду, але бліжэйшым часам плануюцца паездкі па рэгіёнах з мэтай рэкрутства. «Мы з'яўляемся самастойнай арганізацыяй, і хочам аб'яднаць моладзь, якая прытрымліваецца правых поглядаў. На прэзідэнцкіх выбарах мы таксама падтрымаем кандыдата ад правых палітычных сілаў», — сказаў Аляксандр. На справаздачна-выбарчую канферэнцыю «Маладых дэмакратаў», каб расказаць пра сваю дзейнасць, Шумкевіч не з'явіўся. Замест яго справаздачу трымаў Міхаіл Пашкевіч.

Новаабраны старшыня сам выступіў з ініцыятывай абмежаваць час знаходжання на пасадзе кіраўніка арганізацыі двума тэрмінамі. На яго думку, гэта мусіць спрыяць развіццю арганізацыі і выхаванню лідэраў. «Я хачу накіраваць працу на выхаванне і развіццё новых маладых лідэраў, — заявіў Міхаіл Пашкевіч. — Праца на сябе мне не цікавая. Але калі мяне нешта не будзе задавальняць, то я пакіду за сабой права адысці на некаторы час ад палітыкі».

Пад старшынствам Пашкевіча ў асяродку «Маладых дэмакратаў» будуць рыхтавацца палітыкі для Аб'яднанай грамадзянскай партыі, таксама плануецца правесці кампанію па прапагандзе ў грамадстве еўрапейскіх каштоўнасцяў, актывісты будуць прымаць удзел у палітычнай кампаніі на мясцовых выбарах. Бліжэйшым часам арганізацыю чакае своеасаблівы «ўлік» сябраў. «Праблема ў тым, што ў нашым палажэнні было прапісана, што моладзевым дэмакратам з'яўляецца сябра партыі АГП ва ўзросце да 35 год. Цягам месяца мы хочам здзейсніць невялічкую перарэгістрацыю, зрабіць пацвярджанне сяброўства менавіта ў моладзевым крыле. Думаю, стандартны паказчык у дзве-тры сотні чалавек па ўсёй краіне мы маем. У будучым гэта дазволіць больш эфектыўна ацэньваць вынікі працы па колькасці сябраў і іх працы», — патлумачыў старшыня матывы «ўліку».

Што тычыцца супрацоўніцтва з іншымі моладзевымі структурамі, то Міхаіл Пашкевіч, відавочна, большы прыхільнік аўтаноміі, чым саюзаў. «Мы не хочам рабіць кааліцыі дзеля кааліцыі, — адзначае кіраўнік «Маладых дэмакратаў». — З моладдзю БНФ у нас плённыя ўзаемадачыненні, што тычыцца «Маладога Фронту», то калі б быў Іван Шыла, які цяпер знаходзіцца ў войску, можна было б пра нешта гаварыць. Пакуль я не бачу, з кім можна супрацоўнічаць у гэтай арганізацыі. Цяпер нам важна ўрэгуляваць адносіны з партнёрскімі арганізацыямі замежжа. Моладзевыя структуры партый часта вырастаюць у незалежныя. Тут ставіцца іншая мэта — зрабіць «Маладых дэмакратаў» паўнавартасным якасным крылом АГП».

Заяву Шумкевіча пра выхад арганізацыі з партыі АГП Міхаіл Пашкевіч каментаваць адмовіўся, спасылаўшыся на тое, што гэта ініцыятыва аднаго чалавека, а не большасці сябраў арганізацыі.

Беларускія моладзевыя арганізацыі праяўляюць устойлівую тэндэнцыю да падзелаў і расколаў. Звычайна заявы аб выхадзе тых ці іншых групоўвак маюць пад сабой амбітныя планы кіраўнікоў, якія і ствараюць новыя арганізацыі пад сябе, імкнуцца кантраляваць рэсурсную базу. Праўда, вялікай папулярнасці і масавасці яны не набываюць. Выключэнне, колішні выхад «Маладога Фронту» са структуры партыі БНФ.

*P.S.: У дзень абрання на старшынства арганізацыі «Маладых дэмакратаў» Міхаілу Пашкевічу споўнілася 23 гады. За ўдзел у студзені мінулага года ў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў быў асуджаны да двух гадоў абмежавання волі без накіравання адбыцця пакарання ў спецыяльныя ўстановы (хатняя «хімія»). Навучаўся на гістфаку БДУ, за актыўную грамадзянскую пазіцыю, удзел у акцыях пратэсту юнака адлічылі з універсітэта.*

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

Генадзь КЕСНЕР

**21 студзеня ў Беларусі адзначылі Міжнародны Дзень роднай мовы. Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны з гэтай нагоды зладзіла ўрачысты сход у сталічным Палацы мастацтваў, на які прыйшлі вядомыя дзеячы беларускай культуры, навукоўцы, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.**




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Дыктоўка–2009. Справа — амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан



За трыбунай — старшыня Мінскай арганізацыі ТБМ Алена Анісім

Як адзначыла старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ТБМ Алена Анісім, Міжнародны Дзень роднай мовы быў заснаваны рашэннем Трыццатай сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЭСКА ў лістападзе 1999 года. Гэты дзень адзначаецца з мэтай абароны моўнай і культурнай разнастайнасці, да таго ж ЮНЭСКА мае намер стварыць сістэму прэвентыўнага маніторынгу, з дапамогай якога будзе адсочваць стан моваў, што знаходзяцца пад пагрозаю знікнення.

Паводле словаў Алены Анісім, дзень святкавання — 21 лютага — быў абраны таму, што ў гэты дзень у 1952 годзе падчас вулічнай акцыі загінулі некалькі студэнтаў, якія змагаліся за наданне мове «бангла» статусу дзяржаўнай у тагачасным Пакістане, усходняя частка якога праз колькі год стала незалежнай дзяржавай Бангладэш, а самі загінулыя маладыя людзі былі прызнаныя пакутнікамі за родную мову.

«Мы ўжо ў дзесяты раз адзначаем Міжнародны Дзень роднай мовы, і мне хацелася б, каб кожны з нас адчуў і зразумеў: мы ў свеце не адны, у многіх народаў ёсць праблемы — такія як у нас, большыя, меншыя, іншага кшталту, — але ўсе мы вучымся іх вырашаць», — падкрэсліла Алена Анісім.

Старшыня сталічнай арганізацыі ТБМ нагадала, што ў суботу, незадоўга да ўрачыстага сходу, адбыўся першы этап нацыянальнай дыктоўкі. «Гэта быў цудоўны тэкст нашага класіка Уладзіміра Караткевіча — тэкст «Родная мова», і там ёсць вельмі добрыя словы: мова — неўміручая», — сказала Алена Анісім.

Адна з найстарэйшых беларускіх журналістак, супрацоўніца незалежнай газеты «Народная воля» Святлана Кліменценка сталася адной з тых, каго ў гэты святочны дзень Таварыства беларускай мовы ўганаравала дыпломам «Руплівіцу беларускай мовы». «У нашай Беларусі, дзякуй Богу, нягледзячы на той стан, да якога даведзена наша мова, на ўціск, на абразы, на неразуменне, вельмі многа сапраўдных цудоўных людзей, якія разумеюць, што калі згубіш мову — згубіш і самога сябе, і сваю Бацькаўшчыну», — сказала Святлана Кліменценка, атрымліваючы ўзнагароду.

Старшыня Таварыства беларускай школы (ТБШ) Алесь Лозка адзначыў, што апошнімі гадамі памяншаецца колькасць навучэнцаў беларускіх школ. Па словах А. Лозкі, калі 12–13 год таму ў Мінскай вобласці ў першыя беларускія класы прымалася каля 80 працэнтаў вучняў, то цяпер гэтая колькасць скарацілася да 17 працэнтаў. «А ў наступным годзе можа быць яшчэ горш у сувязі са школьнай рэформай», — лічыць кіраўнік ТБШ, таксама ўганараваны дыпломам.

Яшчэ адным лаўрэатам дыплома «Руплівіцу беларускай мовы» ТБМ вызначыла Аляксея Караля — шэф-рэдактара газеты «Новы час». Паводле словаў журналіста, пашырэнне ўжытку мовы тытульнай нацыі паўсядзённа і нават на дзяржаўных тэлеканалах сталася магчымым дзякуючы высілкам менавіта Таварыства беларускай мовы, якое робіць кропкавыя, але сталыя захады дзеля пашырэння беларускага моўнага арэалу. Рэдактар «Новага часу» адзначыў: «Ёсць упэўненасць, што разам з вамі мы ўсе, хто чытае, хто размаўляе па-беларуску, прыйдзем да таго дня, калі беларуская мова будзе гучаць паўсюдна на вуліцы». Па словах Аляксея Караля, «прыклад Украіны побач — ім гэта ўдалося літаральна за год-другі. Я думаю, што і мы не будзем выключэннем, калі адпаведная палітыка ТБМ у адносінах да мовы стане дзяржаўнай палітыкай разам з дэмакратызацыяй краіны».

Апроч згаданых людзей уладальнікамі дыпломаў «Руплівіцу беларускай мовы» сталі лаўрэат міжнародных конкурсаў дакументальнага кіно рэжысёр і педагог Уладзімір Колас, літаратары і навукоўцы Мікола Савіцкі, Анатоль Грыцкевіч, Арсен Ліс, перакладчык Лявон Баршчэўскі, пісьменнік Уладзімір Арлоў, ксёндз-магістр, пробашч мінскага касцёла святых Сымона і Алены Уладзіслаў Завальнюк, многія актывісты з рэгіёнаў Беларусі.

Асабліва ўганараваны за спрыянне развіццю і папулярызацыі беларускай мовы за межамі Беларусі амбасадар Швецыі Стэфан Эрыксан, кіраўнік украінскага дыпламатычнага прадстаўніцтва Ігар Ліхавы (абодва дыпламаты 21 лютага ўзялі ўдзел у першым туры Беларускай дыктоўкі, які прайшоў у сядзібе ТБМ), амбасадары Герык Літвін (Польшча) і Эдмінас Багдонас (Літва), былы пасол Ізраіля ў Беларусі Зэеў Бен-Ар'е і іншыя.

Пры канцы імпрэзы адбыўся невялікі канцэрт беларускіх самадзейных выканаўцаў, а старшыня ТБМ Алег Трусаў нагадаў, што другі і трэці этапы нацыянальнай беларускай дыктоўкі адбудуцца 15 і 25 сакавіка, прычым апошні будзе прысвечаны 91-м угодкам абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

## КАЛОНКА ЮРЫСТА

### КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ



**Мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронцы Алега Волчака на пытанні грамадзян, якія звярнуліся ў грамадскай прыёмную.**

- *Падкажыце, ці можна выселіць з інтэрната злосных неплацельшчыкаў без прадстаўлення ім іншага памяшкання (яны адпрацавалі на прадпрыемстве больш за 10 гадоў)?*
  *Савельева І. П., Масты*

Высяленне з інтэрната рэгулюецца артыкулам 98 Жыллёвага кодэкса. У ім не пазначана ў якасці падставы для высялення сітуацыя, якую вы апісалі. Аднак, у адпаведнасці з артыкулам 36 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, скасаванне дамовы найму жылога памяшкання магчымае па патрабаванні аднаго з бакоў у выпадку парушэння іншым бокам істотных умоў дамовы. А плата за карыстанне жылым памяшканнем з'яўляецца адной з такіх істотных умоў.

- *Жыла з сям'ёй у інтэрнаце. Пазней атрымала кватэру і пераехала туды. У інтэрнаце застаўся пражываць сын з сям'ёй. Ці могуць яго выселіць з інтэрната або даць памяшканне, меншае за тое, што ён займае зараз?*
  *Грыбаедава В. П., Пінск*

Паводле артыкула 98 Жыллёвага кодэкса, часовыя і сезонныя працаўнікі, якія спынілі працу, і грамадзяне, што працавалі па тэрміновай працоўнай дамове, а таксама грамадзяне, што навучаліся ў навучальных установах і выбылі з іх, падлягаюць высяленню з інтэрната, які ім быў дадзены ў сувязі з працай, вучобай, без прадстаўлення іншага жылога памяшкання.

Працаўнікі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, якія пасяліліся ў інтэрнаце ў сувязі з працай, могуць быць выселеныя без прадстаўлення іншага жылога памяшкання ў тых выпадках, калі яны звальняюцца па ўласным жаданні без важкіх падстаў ці звальняюцца за парушэнне працоўнай дысцыпліны або здзяйсненне злачынства, а таксама ў выпадку забеспячэння такіх асобаў іншым жылым памяшканнем у гэтым жа населеным пункце.

У адпаведнасці з артыкулам 71 Жыллёвага кодэкса, ваш сын можа быць выселены па рашэнні суда з прадстаўленнем іншага жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў, агульнай плошчай, меншай за тую, што ён займаў, на ўмовах раней заключанай дамовы найму жылога памяшкання, калі ён ухіляецца на працягу шасці месяцаў без важкіх падстаў ад унясення платы за карыстанне жылым памяшканнем і за камунальныя паслугі.

- *Я пражываю з бацькамі і дзіцем у трохпакаёвай кватэры. З мужам развялася. Муж зарэгістраваны ў кватэры, але пасля разводу ў ёй не пражывае. Ён не жадае адмяняць рэгістрацыю. Што рабіць?*
  *Зайцава А. Л., Віцебск*

Па рашэнні суда, у адпаведнасці з артыкулам 37 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, можа быць прызнана, што былы муж страціў права карыстання жылым памяшканнем у сувязі з выездам на сталае пражыванне ў іншае жылое памяшканне.

Паводле сучаснага жыллёвага заканадаўства, вам неабходна падаць іскавую заяву ў суд аб прызнанні мужа страціўшым права карыстання жылым памяшканнем згодна з артыкулам 37 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Падстава іску — сталае пражыванне ў іншым месцы. Для гэтага вы павінны дакладна ведаць яго месца жыхарства. У іскавай заяве неабходна спаслацца на паказанні сведак, прыкласці даведку ўчастковага па месцы знаходжання вашай кватэры, што былы муж з вамі не пражывае, даведку ўчастковага па месцы знаходжання кватэры, дзе сапраўды пражывае ваш былы муж. Істцамі выступяць усе паўналетнія сямейнікі, з прыцягненнем у якасці трэціх асоб паўналетніх, якія зараз пражываюць у адным жылым памяшканні з былым мужам.

Менавіта гэтага патрабуе праект праграмы Левай партыі, падрыхтаваны да выбараў у Еўрапарламент. Праграму плануецца прыняць на партыйным з'ездзе ў Эсэне. З'яўленне праграмнага пункту з патрабаваннем выхаду ФРГ са складу ЕС выклікала вялікія дэбаты ў краіне. Левая партыя — адна з пяці буйных нацыянальных партый, аднак першая, што адкрытым тэкстам заклікае немцаў супрацьстаяць еўрапейскай інтэграцыі. Самі аўтары праграмы негатыўнае стаўленне да ідэі ЕС тлумачаць антысацыяльным характарам так званага праекту Лісабонскай канстытуцыі ЕС. Аднак шмат хто бачыць у антыеўрапейскай рыторыцы левых вяртанне ў Германію лозунгаў агрэсіўнага нацыяналізму, які набірае шалёную папулярнасць на фоне эканамічнага крызісу.

**Па матэрыялах «Junge Welt» (Германія)**

### КІТАЙ: У ТЫБЕЦКІ НОВЫ ГОД ЧАКАЮЦЦА МАСАВЫЯ БЕСПАРАДКІ

Улады Пекіну пачалі аперацыю па перабросцы ў Тыбет дадатковых вайсковых і паліцэйскіх частак. Чакаецца, што ў час святкавання будысцкага Новага года (яго пачынаюць сустракаць 25 лютага) апазіцыя можа выкарыстаць масавыя зборы людзей на вуліцах, каб выступіць за незалежнасць краю. Тым больш, што псіхалагічна людзі гатовыя: у сакавіку мінулага года падчас вулічных беспарадкаў супраць каланіяльнай палітыкі Пекіну шмат маніфестантаў было забіта. У некаторых гарадах аўтаноміі ўжо адбыліся сутычкі з паліцыяй і арышты. Горад Літан на мяжы з тыбецкай аўтаноміяй наогул пераведзены на вайсковае становішча. Аднак гэта толькі кветачкі. Самыя галоўныя пратэсты чакаюцца ў сакавіку, калі споўніцца 50 год захопу Тыбета войскамі Кітая. Афіцыйныя ўлады абвясцілі дату захопу тыбецкай сталіцы Лхасы ў 1949 годзе святочным днём. У гэты дзень па ўсёй КНР будуць святкаваць канец прыгоннага права, якое панавала ў старым Тыбеце.

**Па матэрыялах «Независимой газеты» (Расія)**




ЦІКАВА

# УКРАІНСКІ ЖЫРЫНОЎСКІ

Іван БІЧ

**Апошнім часам на могілках Кіева стала больш людзей. Справа ў тым, што гарадская мэрыя запланавала ўвесці платны ўваход на могілкі. Такса — дзесяць грыўняў (прыкладна адзін долар). Для студэнтаў і пенсіянераў — скідка 50 працэнтаў. Аўтарам гэтай на першы погляд экзатычнай ідэі (пракуратура, праўда, пазней прызнала яе супярэчнай закону) з'яўляецца гарадскі галава Леанід Чарнавецкі (у палітычных і журналісцкіх колах яго называюць Лёня Космас). Апошнім часам, дзякуючы незвычайным заканадаўчым актам і шакіруючым заявам, ён заслужыў рэпутацыю ўкраінскага Жырыноўскага.**



> *«Я буду зарабляць мільён долараў у дзень. Хто спявае лепш за мяне? Толькі Бог».*
> *Леанід Чарнавецкі пра будучыя маштабы продажу дыску, які ён збіраецца запісаць*

Леанід Чарнавецкі нарадзіўся ў 1951 годзе. Вырас у Харкаве. Фактычна ягоны шлях ва ўладу пачаўся ў 1970 годзе, калі Леаніда забралі войска. Ён служыў у частках унутраных войскаў, адкуль яго накіравалі вучыцца ў элітны Харкаўскі юрыдычны універсітэт. Гэта быў амаль што адзіны выпадак у гісторыі савецкай арміі. Сам Чарнавецкі ў сваёй біяграфіі піша, што права вучыцца ў ВНУ яму дасталася «за добрую службу». Апаненты сцвярджаюць, што сваім паступленнем ён абавязаны бурнаму раману з Алінай — дачкой генпракурора Кіеўскай вайсковай акругі. Атрымаўшы дыплом юрыста, Чарнавецкі нейкі час працаваў следчым у Кіеве, потым паступіў у аспірантуру, зрабіў акадэмічную кар'еру — стаў прарэктарам мясцовага універсітэта. У часы незалежнасці ён сышоў у бізнес. Зарабіўшы першыя грошы на продажы кватэр, Чарнавецкі заснаваў свой банк. Пазней стаў дэпутатам Вярхоўнай Рады ад Нашай Украіны. У 2006-м яго абралі мэрам.

> *«Зараз шмат хто хоча жабак-нябожчыкаў на могілках хаваць. Калі ласка. Помнік жабе можна замовіць у нас за тысячу долараў. І ўсё. Жаба будзе ведаць, што пражыла жыццё не дарма»*
> *Леанід Чарнавецкі пра арганізацыю ў Кіеве могілак для жывёл*

Перамога Чарнавецкага стала сенсацыяй. Даследуючы механізм ягонай перамогі, праціўнікі хутка высветлілі, што электаральная база Чарнавецкага — пенсіянеры, асабліва старыя бабулькі. За некалькі гадоў да выбараў яны рэгулярна атрымлівалі ад яго паёк танных прадуктаў. За раздачу пайкоў былі адказныя спецыяльныя брыгадзіры, пад наглядам якіх знаходзіліся звычайна 3–4 дамы. Брыгадзіры павінны былі не толькі раздаваць ежу, але і цікавіцца побытавымі патрэбамі кліентуры. Банк Чарнавецкага, напрыклад, браў на сябе аплату дробных рамонтаў. Дзякуючы мабілізацыі гэтай часткі электарату ў дзень выбараў Чарнавецкі і стаў мэрам.

> *«Да новага года прадаць усё жывое, што рухаецца і возіць жонак маіх намеснікаў і кіраўніцтва на рынкі, дзяцей у школу, замест таго, каб працаваць на жыхароў Кіева».*
> *Леанід Чарнавецкі пра аўкцыён па продажу аўтамабіляў адміністрацыі*

Хутка ў мэра Чарнавецкага з'явіліся праціўнікі ў асобе славутага баксёра Віталя Клічко, які падаўся ў палітыку, і Юліі Цімашэнка. Яны разгарнулі кампанію за адстаўку мэра, крытыкуючы перш за ўсё яго практыку некантраляванага распродажу камунальнай зямлі. Аднак нечакана на бок Лёні стаў прэзідэнт Ючшанка і яго Наша Украіна. Увесну 2008 года падчас аднаго з урадавых крызісаў фракцыі Ючшанкі былі патрэбныя галасы дэпутатаў Блоку Юліі Цімашэнка (БЮТ). Апошнія былі не супраць падтрымаць Нашу Украіну, аднак выставілі ўмову: абвесціць пазачарговыя выбары кіраўніка кіеўскай адміністрацыі. Ючшанка пагадзіўся. Рада прыняла адпаведны ўказ. Выбары прайшлі. Аднак у выніку Чарнавецкі перамог. І зноў за кошт галасоў пенсіянераў. «Выратуй Кіеў, схавай пашпарт бабулі», — жартавалі ў прэсе напярэдадні дня выбараў.

> *«Паслухайце, што там адбываецца: палову моргу здалі для багатых, і ў гэтых моргах іх трымаюць у такім камфорце. Яны хутка ператварацца ў жывых. Там кандыцыянеры, халадзільнікі, месцы на могілках».*
> *Леанід Чарнавецкі пра карупцыю ў сектары рытуальных паслуг*

Бабулькі (мэр называе іх «любімыя бабулькі») апошнім часам сталі класам-гегемонам у Кіеве. Спасылаючыся на тое, што ён — прадстаўнік інтарэсаў бабуль, мэр запусціў шэраг эксцэнтрычных рэформаў. Напрыклад, уводзіцца тэлефонная служба платных кансультацый ветэрынараў. Мэр лічыць, што яна павінна прынесці мільярд грыўняў. У кіеўскім заапарку адпаведна спецыяльнаму загаду мэра будуць прадавацца матрошкі з фізіяноміямі палітыкаў. «Заапарк будзе напоўнены грашыма да адказу», — прагназуе гарадскі галава. Усе зробленыя дзяцьмі дзіцячых садкоў на творчых занятках фігуркі будуць ісці на спецыяльныя кірмашы. Чарнавецкі прапануе забіраць у старых адзінокіх пенсіянераў кватэры, прадаваць іх, а былых гаспадароў адпраўляць у пансіёны. Аналітыкі звязваюць выбух актыўнасці мэра з вялікай дзіркай, якая ў выніку ягонай дзейнасці з'явілася ў гарадскім бюджэце. Так ці інакш, зняць яго з пасады фактычна немагчыма. Гэта робіць Чарнавецкага як палітыка з моцным фінансавым рэсурсам (Кіеў — самы багаты горад Украіны) салідным акцёрам на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Калі, натуральна, да гэтага часу ён не даканае горад сваімі рэформамі ў імя любімых бабуляў.

> *«Вы жадаеце пабіць Клічко?»*
> *Леанід Чарнавецкі ў звароце да сваіх прыхільнікаў, якімі галоўным чынам былі бабулі*

ВЫБАРЫ

# АЛЬТЭРНАТЫВА БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Алег НОВІКАЎ

**1 сакавіка ў Краіне Баскаў адбудуцца сапраўды гістарычныя выбары. Упершыню за гісторыю існавання басккай аўтаноміі да ўлады прыйдуць сацыялісты, якім у цяперашняй сітуацыі проста няма альтэрнатывы.**

Баскская аўтаномія, або Euskadi, у цяперашнім стане існуе з 1978 года, калі пасля смерці Франка ў Іспаніі пачаліся працэсы дэмакратызацыі, складовай часткай якой было вяртанне рэгіёнам праў на самакіраванне.

Самі ж баскі адмаўляюцца называць тэрыторыю аўтаноміі Краінай Баскаў. На іх думку, у склад краіны павінны таксама ўваходзіць некаторыя правінцыі Францыі і Іспаніі. У канстытуцыі аўтаноміі ёсць дзіўны пункт. Адпаведна яму, цяперашняя сталіца аўтаноміі горад Віторыя — часовы пункт рэзідэнцыі баскскіх органаў улады. У будучыні сталіца павінна быць перанесеная ў галоўны адміністратыўны цэнтр правінцыі Навара, горад Памплона (менавіта тут існуе традыцыя штогод выпускаць быка на вуліцы). Навара, якая ў Сярэднявеччы была асобнай дзяржавай, разглядаецца гісторыкамі як калыска баскскай дзяржаўнасці.

Нягледзячы на дэталі, аўтаномія ўжо існуе, і ўвесь гэты час лідэрамі яе ўраду былі сябры Баскскай нацыянальнай партыі (PNV) — самай першай партыі баскаў, створанай яшчэ ў 1895 годзе заснавальнікам баскскага нацыяналізму Сабіна дэ Арана.

Хаця Арана быў заўзятым каталіцкім кансерватарам і лічыў, што задача ягонай партыі — «абарона баскскай расы», з часам PNV стала на больш дэмакратычныя пазіцыі. У 30-я гады менавіта PNV нягледзячы на грозныя інструкцыі з Ватыкану і крытыку з боку прыхільнікаў лозунгу поўнай незалежнасці, пагадзілася на стварэнне аўтаноміі. Апошняя, аднак, была знішчана пасля падзення рэспублікі. Пасля чаго дзеячам PNV давялося эміграваць.

Нараджэнне напрыканцы 50-х гадоў радыкальнай баскскай групоўкі ETA (Краіна Баскаў і Свабода), якая заваявала сваімі баявымі акцыямі вялікую папулярнасць сярод моладзі, здавалася, паставіла крыж на намерах PNV заставацца вядучай сілай баскскага супраціву і дзяржаўнага будаўніцтва. Аднак пасля рэстаўрацыі дэмакратычных парадкаў PNV здолела адрадзіцца. Еўрапейскія кансерватары прынялі спецыяльны план дапамогі калегам. Адпаведна, трыццаць гадоў сябры PNV былі кіраўнікамі баскскага ўраду. І вось цяпер іх манаполіі, здаецца, прыйшоў канец. Лічыцца, што на выбарах у парламент нацыяналіст Хуан Хасэ Ібарэчэ) перадасць функцыі Lehendakari (прэм'ер баскскага ўраду) сацыялісту Патксі Лопесу.

Прыход сацыялістаў да ўлады — гэта катастрофа для баскскага нацыяналістычнага руху, які за 30 гадоў не змог узгадніць агульныя тактычныя задачы. Калі дыктатура Франка пачала рушыцца, у гатэлі «Xiberta» ў французскім горадзе Англе адбылася гістарычная сустрэча нацыяналістычных груповак з удзелам PNV. Мова ішла пра агульныя задачы руху баскскіх нацыяналістаў. PNV адмовілася ад праекту ETA і так званых arbetzale («патрыёты», так называюць левых нацыяналістаў). Яна запатрабавала ад Мадрыда ў якасці ўмовы лаяльнасці прызнаць права баскаў на стварэнне асобнай дзяржавы. Кансерватары абмежаваліся лозунгамі аўтаноміі для трох правінцый. У якасці бонусу Мадрыд абраў PNV як галоўнага партнёра перамоваў па баскскаму пытанню.

З тых часоў незалежніцкі лагер расколаты. PNV з падазрэннем ставіцца да arbetzale, якія ў сваю чаргу лічаць, што ўсе незалежніцкія ініцыятывы кансерватараў прывязаныя да электаральнага графіку. Некалькі разоў партыі быццам дамаўляліся, аднак хутка зноў сварыліся. Сітуацыя яшчэ больш пагоршылася пасля таго, як Мадрыд забараніў галоўную партыю лагера arbetzale — «Batasuna», а таксама і яе нашчадка — «Herri Batasuna» — за сувязь з тэрарыстамі з ETA. Цяпер arbetzale, якія не могуць браць удзел у выбарах (любая выбарчая ініцыятыва забараняецца), перанеслі фокус дзейнасці ў трэці сектар і падрываюць сацыяльную базу кансерватараў. Яшчэ напрыканцы 90-х яны дабіліся, каб прафсаюз LAB, звязаны з PNV, прыняў рэзалюцыю пра неабходнасць пашырэння правоў аўтаноміі.

У сваю чаргу PNV, нягледзячы на радыкальную незалежніцкую рыторыку, не змагла пашырыць межы аўтаноміі. У 2002 годзе Ібарэчэ прапанаваў план, які павінен быў закончыцца рэферэндумам пра новы статус Краіны Баскаў — асацыяваная дзяржава ў складзе Іспаніі. Мадрыд назваў праект супярэчным канстытуцыі, а arbetzale ўвогуле паставіліся да яго крытычна (у тэксце плану не казалася пра тое, што ў склад Краіны Баскаў павінна ўвайсці Навара). У выніку ідэя правалілася. Яшчэ больш крыўдным для PNV было тое, што ў той жа час каталонцы дамагліся прыняцця новага статусу для сваёй аўтаноміі і дабіліся галоўнага — яны прызнаны Мадрыдам асобнай нацыяй, што адчуване перад імі прававыя далягляды патрабаваць у будучыні поўнай незалежнасці. Нарэшце PNV не скарысталася добрым момантам у пачатку 90-х, калі пачаўся раскол Югаславіі, а Захад прызнаў Харватыю і Славенію. На думку экспертаў, гэты быў зручны момант патрабаваць перагляду статусу Краіны Баскаў у складзе Іспаніі. Адсутнасць прагрэсу плюс карупцыйныя скандалы — следства манапалізацыі ўлады на працягу 30 гадоў, у выніку прывялі да крызісу партыі і падзення яе рэйтынга яе папулярнасці.

Сацыялісты ў такой сітуацыі сталі галоўнай альтэрнатывай PNV. Увогуле, баскскі сацыялістычны рух узнік у лоне агульнага іспанскага руху працоўных, і толькі ў 30-я яго лідэры пачалі казаць пра права баскаў на аўтаномію і незалежнасць. Аднак пры гэтым сацыяльным падмуркам сацыялістаў былі рабочыя кварталы, дзе жывуць этнічныя іспанцы, якія прыехалі ў Краіну Баскаў у 50–60-я. Магчыма таму Партыя сацыялістаў Краіны Баскаў (PSE) усё роўна па сутнасці астаецца філіялам Іспанскай сацыялістычнай працоўнай партыі (PSOE).

Адносіны сацыялістаў да баскскага пытання цяжка назваць роўнымі. За гады дэмакратыі сацыялісты радыкальна мянялі свае падыходы. Напрыклад, у пачатку 80-х урад PSOE сфармаваў сакрэтныя каманды, якія павінны былі тайна забіваць лідэраў баскскага руху. У 1988 і 2005 гадах фактычна вялі перамовы з ETA. Прычым у 1988-м на афіцыйным узроўні ETA называлася не «банда тэрарыстаў», а «палітычная арганізацыя». Самі лідэры баскскіх сацыялістаў неаднаразова прызнаваліся, што падтрымліваюць кантакты не толькі з сябрамі «Батасуны», аднак нават і непасрэдна ETA. Калі б такое сказаў нейкі палітык arbetzale, яго адразу кінулі за краты за сувязь з тэрарыстамі. Аднак з PSE паліцыя размаўляе інакш. Дастаткова гнуткі і прагматычны падыход PSE да нацыянальнага пытання дае падставы спадзявацца на аднаўленне мірнага дыялогу ў краі.

Таксама не трэба забываць, што імідж кіраўнікоў аўтаноміі накладае фармальныя абавязкі падтрымліваць нацыяналістычны дыскурс, садзейнічаць развіццю нацыянальных культурных інстытутаў. Так, каталонскі філіял PSOE, які быў сфармаваны за кошт працоўных, якія прыехалі ў Каталонію з Іспаніі, з часам стаў больш пазітыўна ставіцца да ідэі пашырэння правоў каталонскай аўтаноміі. Нельга забываць,што ў 1993-м годзе ў PSE калектыўна ўступілі нацыяналісты з партыі Euskadiko Ezkerra (Баскскія левыя), якая пачыналася як групоўка ў складзе ETA.

У сваю чаргу нацыяналісты, якія пераходзяць у апазіцыю, і arbetzale маюць час разам падумаць і зразумець урокі паражэнняў апошніх трыццаці гадоў. Дарэчы, Філіп Гансалес, былы сакратар PSOE і іспанскі прэм'ер, лічыць, што для вяртання ва ўладу PNV патрэбна ўсяго 6–8 гадоў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЭВА МАРАЛЕС

Калі паўсюдна ў свеце заробкі зніжаюцца, то ў Балівіі яны будуць падвышацца. Эва Маралес, прэзідэнт Балівіі, прапанаваў парламенту закон аб павышэнні заробкаў для медыкаў, настаўнікаў, паліцэйскіх і вайскоўцаў. Яны будуць атрымліваць на 14 працэнтаў больш. Акрамя таго закон змяніў мінімальны памер заробка. Ён вырас на 10 працэнтаў. Такім чынам, цяпер у Балівіі працадаўца павінен плаціць працоўнаму штомесяц як мінімум 647 балівіана (гэта прыкладна 92 долара). Прадстаўляючы законапраект, Маралес папрасіў прабачэння ў электарату. Па яго словах, ён хацеў увогуле ўзняць заробкі на сто працэнтаў, аднак людзі ў міністэрствах далі яму зразумець, што такі крок прывядзе да краху дзяржаўнага бюджэту. Саюз прадпрымальнікаў між тым выступіў супраць прапаноў Маралеса. На думку бізнесменаў, рэалізацыя закону ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу прывядзе выключна да росту інфляцыі.



### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ

У культавай фігуры украінскай антыаранжавай апазіцыі апошнім часам узніклі вялікія праблемы. Ягоная Партыя Рэгіёнаў на мяжы расколу. Пасля правалу спробы Партыі Рэгіёнаў 5 лютага адправіць кабінет Цімашэнка ў адстаўку, сябры партыі пачалі шукаць адказнага за фіяска ў сваіх шэрагах. Пошук стрэлачніка перарос у вайну дзвюх фракцый — групы Рэната Ахметава (самы заможны чалавек ва Украіне) і групы Сяргея Лёвачкіна, звязанага з мільярдэрам Дзмітрыем Фірташам. Барацьба ўнутры партыі працягваецца і становіцца ўсё больш інтрыгуючай. Чаго не скажаш пра прэзідэнцкую кампанію Януковіча, якая фактычна заглухла. Між тым зараз менавіта ён — асноўны кандыдат на пасаду наступнага прэзідэнта Украіны. За яго гатовы галасаваць 21 працэнт выбаршчыкаў. Бліжэйшы канкурэнт Юлія Цімашэнка можа пакуль разлічваць толькі на 17 працэнтаў.

### ПОЛ ГОЛДЫНГ



27-гадовы беспрацоўны з брытанскага горада Суонлі, сябра праварадыкальнай Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP) нечакана нават для сябе перамог на адным з участкаў на пазатэрміновых выбарах у гарадскі савет. Нацыяналісты і раней перамагалі на мясцовых выбарах, аднак не з такой перавагай. Голдынг атрымаў 41 працэнт усіх галасоў выбаршчыкаў і таму стаў палітыкам тыдня на ўсім Альбіёне. Праўда, трэба ўзяць пад увагу, што Суонлі яўна нетыповы горад. Гэта хутчэй ціхі прыгарад Лондану, які толькі зараз сутыкнуўся з феноменам мусульманскай і індуісцкай эміграцыі. Адсюль і такія лічбы. Так ці інакш, Нік Грыфін — старшыня нацыяналістаў — ужо заявіў, што яго партыя можа разлічваць на ўраджай галасоў у 9 працэнтаў на наступных выбарах у Еўрапарламент, што гарантуе партыі прадстаўніцтва ў Бруселі.

▸ **НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ**

# НЕ ПІСЬМЕННІЦА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Нядаўна мяне запрасілі святкаваць народзіны ў вялікую вясёлую кампанію. Была зіма — не толькі на календары, але і на вуліцы. Калі госці наеліся і ідэі для забаваў пачалі ссякаць, нечакана паўстала ініцыятыва:**

**— Народ, хадзем на санках катацца!**

**— Нееее, — застагнаў народ. Мароз на вуліцы, ісці далёка — дый што мы дзеці малыя?**

**— Народ, вы што? Ды калі вы апошні раз з горкі каталіся? І калі яшчэ пакатаецеся? Колькі там той зімы? Колькі там таго жыцця? Народ, устаем і пайшлі!**

**Народ устаў і пайшоў, мы гадзіну коўзаліся з ільдзянай гары на кавалках кардону, весяліліся і радаваліся жыццю, зіме, марозу. Тою, хто так актыўна, рашуча і, галоўнае, паспяхова падбіў калятрыццацігадовых дарослых людзей на такі несур’ёзны занятак, была Дар’я Кастэнка. Менавіта тады я вырашыла, што я пра яе напішу.**



Мая сённяшняя гераіня — менавіта гэтая 24-гадовая Даша. З часоў Вясны–2006 прайшло амаль тры гады, «Сакавіцкія дзённікі» Дар’і Кастэнка ўспрымаюцца цяпер зусім па-іншаму. Са зразумелай дыстанцыяй і халоднай аналітыкай

## Набалелацьс слова

Усе гады нашага з ёй знаёмства я ведала: Даша піша, але яна — не пісьменніца. Рэч была нават не ў яе журналісцкай адукацыі — выпускнікі журфака БДУ вельмі актыўна падаюцца ў краснае пісьменства. Проста Дар’я Кастэнка заўсёды была для мяне акурат з тых маіх калегаў, хто ўспрымае свой дар як рамяство, як хлеб, як кунг-фу, якое сапраўдны майстар ніколі не дэманструе без патрэбы. Па той жа прычыне факт, што Даша стала аўтарам «Сакавіцкіх дзённікаў» — самага чытанага дакумента вокамгненнай, але такой важнай для часткі жыхароў Беларусі «мікраэпохі» грамадзянскага пратэсту пасля выбараў 19 сакавіка 2006 года, — абсалютна не здзівіў мяне. Проста надышоў час дэманстраваць кунг-фу.

Не — ну катэгарычна не пісьменніца! Пару празаічных урыўкаў, чытаных калісьці ў інтэрнэце, — не ў лік. У яе нават уласнага блогу ў доўгі час не было: цяпер ён ёсць, але гэта прыватная старонка для сяброў, а зусім не рэйтынгавы рэсурс грамадзянскай актывісткі. У сакавіку 2006-га яна запісвала тэкст у просты файл, на дыскету і высылала па электроннай пошце сяброўцы, а ўжо тая публікавала гэтыя падзённыя справаздачы ў сеціве, атрымліваючы водгук ад рускамоўных чытачоў ва ўсім свеце. Пік папулярнасці зацемак прыйшоўся на самі падзеі — 19–22 сакавіка; дапісвала Даша дзённік ужо ў красавіку, вызваліўшыся з турмы на Акрэсціна, куды трапіла на 10 сутак у ноч разгону намётавага мястэчка 23–24 сакавіка. Але гэтых цэнтральных фрагментаў яе хронікі не было б без першай часткі, якая і дала назву твору, што ў выніку атрымаўся. Даша была актыўнай удзельніцай перадвыбарчых падзеяў — агітавала за Аляксандра Мілінкевіча, а пасля назірала на выбарах. Яе дзённік пачаўся 2 сакавіка, напярэдадні ўгодкаў гістарычнай бітвы на Нямізе і пасля таго, што назвалі «бітвай на Нямізе» журналісты, — запужанага АМАПам мітынгу ў падтрымку Мілінкевіча на мінскай плошчы Свабоды. Тады мы ўсе пачыналі лавіць у штодзённасці сімптомы гістарычнасці. А Даша вырашыла, што будзе пісаць:

*«Можа быць, гэтыя файлы дапамогуць тады мне ці каму-небудзь згадаць, як усё было насамрэч. Калі нехта адважыцца згадваць, калі камусьці гэта будзе патрэбна. Я веру, што будзе. Таму буду запісваць усё, што пабачу і пачую. У эпоху інфармацыйных войнаў яшчэ больш, чым тысячу год таму, патрэбныя ананімныя летапісцы.*

*Завіце мяне проста Даша.*

*Я — маленькі чалавек. Не баец, не агітатар, не гарлан, не главар. Мне вельмі страшна. Але я буду рабіць тое, што лічу сваім абавязкам».*

І разам з тым не-пісьменніца Дар’я Кастэнка стала аўтаркай ці не самага значнага твора найноўшай беларускай літаратуры. Уражаны яго розгаласам у інтэрнэце, а таксама агульным усплёскам «народнай публіцыстыкі» падчас і пасля апошніх выбараў Андрэй Дынько нават быў абвясціў жанр дзённіка негалоснай тэмай ПЭН-цэнтраўскага конкурсу маладых літаратараў, прысвечанага стагоддзю газеты «Наша ніва». Але не надта атрымалася. Ці то аўтары дзённікаў не пабачылі ўнутранай патрэбы іх на суд журы дасылаць, ці то дасланае надта ўжо недацягвала да ўзроўню «ісціннай літаратуры». Нядзіўна. Рэальныя падзеі, і толькі яны, погляд знутры, гіперасабістае стаўленне да ўсяго, што адбываецца навокал, — і ўжо потым тэкст, сам стыль якога наўпрост залежыць ад умоваў, у якіх ён ствараўся: у выпадку з Дашай — спешка, недасып, халодная камера, шок пасля сутак у заключэнні… І разам з тым — голая эмоцыя, шчырасць, якая, тым не менш, не замінае паслядоўнай выкладцы фактаў. Вось што такое «Сакавіцкія дзённікі». Вось тое, за што мы ўсе іх чыталі.

## Абпечаныя поўдні

Феномен «Сакавіцкіх дзённікаў», магчыма, больш зразумелы таму, хто ведае гісторыю стварэння двух сусветна вядомых помнікаў літаратуры — «Нататкі ля ўзгалоўя» японскай пісьменніцы XI стагоддзя Сэй-Сёнагон і кнігі «У заднім доме», больш вядомай як «Дзённік Ганны Франк», аўтарка якога — яўрэйская дзяўчынка, якая ў 1942–1944 гадах разам з сям’ёй хавалася ад нацыстаў у Амстэрдаме. Японская дама — фрэйліна імператрыцы, цягам многіх год рабіла выкшталцоныя запісы для сябе, пасля чаго дзённік нейкім чынам быў абнародаваны і ператварыўся ў звышпапулярны раман: даследчыкі кажуць, «выкраданне» «Нататак…» — аўтарскае какецтва: тое, што было інтымным, з цягам часу перагледжана аўтаркай і ператворана ў кнігу «для ўсіх». Дзяўчынка Ганна пачула па эмігранцкім радыё, што трэба захоўваць для будучыні ўсе сведчанні фашысцкіх зверстваў, асабліва дзённікі, і пачала перарабляць тое, што пісала ў форме лістоў да выдуманай сяброўкі Кіці, у раман, не паспеўшы, аднак, да арышту сям’і і высылкі ў канцлагер, дзе памерла ад тыфу ў 1945 годзе…

У Дар’і Кастэнка таксама два адрасаты — яна сама ў будучыні і той, каму «гэта будзе патрэбна». Звяртаючыся да іншых, яна ставіла дзве канкрэтныя мэты: насуперак хлусні афіцыйных СМІ данесці да людзей праўду і захвоціць пакуль што абыякавых далучыцца да акцый пратэсту. У фінальнай частцы «Дзённікаў» яна з гонарам згадвае, што сустракала людзей, загітаваных іх пачаткам.

Дзіўны эфект такога чытва: мы прагна глытаем яго дзеля экзатычных ці трагічных, экстрэмальных умоваў, у якіх яно стваралася, выносім з яго канкрэтную інфармацыю, у той час як для аўтара галоўнае зусім не гэта. Ахвяра халакосту Ганна Франк шакуе чытачоў, якія так шмат пра яе чулі, падлеткавымі комплексамі, побытавымі падрабязнасцямі ды скаргамі на дарослых. Дзённік гераіні раздушанага бульдозерамі намётавага мястэчка, апроч тых жа побытавых падрабязнасцяў, перапоўнены рамантызмам, сантыментамі, гумарам, спачуваннем, прыязнасцю, любоўю да людзей, з якімі была поплеч, і нянавісцю да тых, хто выступіў супраць.

Даша пераказвае страшныя і смешныя падзеі, што мелі месца навокал, шчыра прызнаецца нават у тым, што ў беларускай літаратуры прынята хаваць ад вечнасці. Напрыклад, расказвае, якім чынам у намётавым мястэчку была арганізаваная прыбіральня. Ці як, збіраючыся на суд у камеры, выбрала самы няцёплы швэдар, бо ён прыгожы, і памыла галаву пад ледзяной вадой, каб выглядаць добра. Аповед яе ператвараецца то ў нізку анекдотаў, то ў баявік (сцэны разгону намётавага мястэчка), то ў турэмны дзённік, то ў мілосны ліст… Даша цытуе шмат вершаў, ці, хутчэй ,— тэкстаў песень. У асноўным, рускіх бардаў, творчасцю якіх захапляецца, чые песні спявала ў сакавіку пад гітару, таксама раздушаную бульдозерамі. «*Прекрасное далёко*» і «*Крылатые качели*» названыя ёй сярод рэпертуару герояў Плошчы. Тожа мне, змагары, тожа мне супраціў! — сказаў бы радыкал. Рамантыкі рэвалюцыі, якія сабраліся там, з галавой выдалі сябе, — паіранізаваў бы цынік. Але менавіта дзякуючы рамантычнаму пафасу напісанае Дашай цягам таго месяцу чытаецца на адным дыханні.

## Смех дзіцячы

Я даўно заўважыла: самы просты спосаб апісаць Дар’ю Кастэнка хаваецца ў вершах яе аднафаміліцы — выбітнай украінскай паэткі, лірычнай патрыёткі Ліны Кастэнка (Даша нарадзілася ва Украіне, школу скончыла ў Берасці). Напрыклад, адзін верш у перакладзе іншай жыхаркі Берасцейшчыны — паэткі Ніны Мацяш. Змяшчу яго сюды цалкам, як зрабіла б ва ўласным тэксце сама Даша, праціўніца вырываць цытаты з цэлых вершаў:

*******

*Дабранач, сонца! Дзякую за дзень.*
*Дабранач, сонца! Дзякую за стому.*
*І за лясоў прасветлены Эдэм,*
*і за валошку ў золаце саломы.*

*За твой світанак, і за поўдзень твой,*
*і за мае абпечаныя поўдні.*
*За ўсё, што ўчора квет здарыла свой,*
*за ўсё, што заўтра ў рост зялёны пойдзе.*

*За смех дзіцячы, за мой зорны міг.*
*За ўсё, што я магу, за ўсё, што мушу.*
*Дабранач, сонца! Дзякую за ўсіх,*
*хто анічым сваю не збрыдзіў душу.*

*За ўсё, што прагне песні ды надзей.*
*Што дзесьці ў свеце кроў шчэ не праліта.*
*Дабранач, сонца! Дзякую за дзень,*
*за набалеласць слова як малітвы.*

Даша — адна з самых узнёслых асобаў з усіх, каго я сустракала ў жыцці.

«Яны проста гуляюць», — сказаў пра маладых герояў «Плошчы Каліноўскага» Валянцін Акудовіч, пасля чаго кансерватыўна настроеныя чытачы «ARCHE» вокамгненна абвясцілі яго «ворагам беларушчыны». Але, дашчэнту дыскрэдытаваўшы маладзевы супраціў, мысляр працягнуў: «…гульня (не блытаць з забавай) — рэч куды больш сур’ёзная і важная, чым хоць якое змаганне.

Бо толькі праз гульню (у самых розных яе праявах) магчымае тварэнне культуры, а значыць і тварэнне чалавека як чалавека». Даша, на першы погляд, не рабіла нічога звышгераічнага і звышкарыснага для сусветнай рэвалюцыі. Пранесла на Плошчу намёт. Гатавала гарбату, грала на гітары лірычныя песні. Пісала ўзорна-паказальны твор жаночай дзённікавай літаратуры. Пакорліва пайшла ў аўтазак падчас разгону. Яна проста гуляла. Але яе як не-пісьменніцы галоўная заслуга ў тым, што, калі чытаеш занатаваныя ёй радкі, у цябе складаецца ўражанне: падчас гэтай гульні яна перадае пас менавіта табе.

### Зорны міг

«Сярэдні век людзей на Кастрычніцкай плошчы будзе недзе мой. 24 гады». Мая сённяшняя гераіня — менавіта гэтая 24-гадовая Даша. З часоў Вясны–2006 прайшло амаль тры гады, «Сакавіцкія дзённікі» Дар'і Кастэнка ўспрымаюцца цяпер зусім па-іншаму. Са зразумелай дыстанцыяй і халоднай аналітыкай. Напэўна, было б цікава патэлефанаваць аўтарцы, задаць ёй пытанні канкрэтна па тэксце: ці сапраўды Плошча сталася «найважнейшым і найлепшым», што здарылася з ёй у жыцці? Ці камунікуе яна з былымі сукамерніцамі праз сацыяльную сетку «Аднакласнікі»? Як яна ставіцца да «мярзотнікаў», якія скарысталіся яе рэвалюцыяй? Цікава — але навошта? Гэта, канешне, быў бы надзённы і рэйтынгавы — але зусім іншы жанр. Не гэты.

Жыццё пасля Плошчы… Многія з нас тады задавалі сабе пытанне: што са мной будзе? У тым ліку і Даша — «Сакавіцкія дзённікі» поўныя панічнай варажбы на кававаай гушчы з тэрмасу. Як і тры гады таму, Дар'я Кастэнка жыве ў Беларусі, працуе ў навуковым часопісе «Адукацыя і выхаванне», адкуль ніхто нават не падумаў яе звальняць за розгаласныя, перакладзеныя на некалькі моваў «матэрыялы не па тэме» (хто ведае, а можа — акурат па тэме?), гуляе ў інтэлектуальныя гульні ў адной з самых моцных беларускіх каманд (якая, дарэчы, называецца «Хунта»), кожнае лета экстрэмальна вандруе з сябрамі: Крым, Скандынавія. У канфліктных сітуацыях ідзе вайной у абарону слабых, а калі марозіва жыцця пачынае ўтопліваць у сябе сваю разынкі, — падбівае сяброў на самыя неверагодныя здзяйсненні.

Калі мы каталіся з горкі, яна ўскідвала галаву ў святле ліхтароў і смяялася. Як у многіх бландынаў, на марозе яе нос заліўся густой чырванню — хацелася хутчэй узяць яе ў цяпло, захутаць у коўдру і напаіць гарбатай. І я згадала Плошчу, намётавае мястэчка, бачанае на ўласныя вочы, — і вэзахронію. На многіх кадрах можна было заўважыць Дашу. Выраз твару быў абсалютна іншы. Спужаны. Рашучы. Засяроджаны. Пазбаўлены касметыкі. Поўны надзеі. Але адна дэталь была тою самай — ярка-чырвоны ад анамальнага холаду той вясны нос. Даша глядзела, як народ скотваецца з ільдзянай горкі, ускідвала галаву з чырвоным носам і смяялася. Менавіта тады я вырашыла, што я пра яе напішу.

ВАРТА ПРАЧЫТАЦЬ

# АНАТОМІЯ НЯНАВІСЦІ

Аляксей КАРОЛЬ

**Паступіла ў продаж кніга Анатоля Тараса «Анатомія нянавісці. Руска-польскія канфлікты ў XVIII–XX стст.» Гэта ўжо трэцяя кніга з серыі «Невядомыя войны».**




Аўтар ідэі, канцэпцыі і кіраўнік праекта Анатоль Тарас. «Анатомія нянавісці», як і ўся трылогія, падпарадкавана адной задачы: аднавіць аб'ектыўную карціну складанага гістарычнага працэсу расійска-польскіх адносін узамен тых міфаў, што панавалі ў афіцыйнай версіі гісторыі на працягу некалькіх стагоддзяў.

Мэта дасягнутая. «Анатомія нянавісці» абрушвае не адзін і нават не дзесятак гістарычных міфаў, а адну з апорных канструкцый усёй савецкай канцэпцыі расійска-польскіх адносін. Канцэпцыі, якая была збудавана цалкам на расійскай традыцыі гістарыяграфіі. Прычым традыцыі выключна імперскай, з якой былі падчыстую выдалены ўсе адценні іншых падыходаў, уласцівых іншым школам прагрэсіўных расійскіх гісторыкаў. Самай рэакцыйнай імперскай канцэпцыі ў новым таталітарным фармаце.

Ні адна эпоха не спараджае столькі міфаў, як эпоха таталітарызму,ператвараючы па сутнасці ў адзін суцэльны міф усю папярэднюю гісторыю не толькі сваёй дзяржавы, але і сусветную. Тымі ж метадамі, што і ў палітыцы, — рэпрэсіямі і прапагандай. З навуковага і грамадскага ўжытку, з памяці штучна выціраюцца цэлыя пласты фактаў і падмяняюцца схемай, наборам клішэ і штампаў, зляпленых пануючай ідэалогіяй у нейкае падабенства канцэпцыі. У якой злодзеі пераўтвараюцца ў герояў, паразы — у перамогі і наадварот. Па дакладнаму вызначэнню бессмяротнай антыўтопіі Оруэла: «Ілжа ёсць праўда, праўда ёсць ілжа». Жудасная, шэрая жалезабетонная канструкцыя, якую, здаецца, нікому і нічым не зваліць.

У цісках гэтых міфаў асабліва не шанцуе гісторыі народаў і краін, што трапілі ў межы таталітарных імперый. Іх уласная гісторыя наогул знікае, што і адбылося з гісторыяй Беларусі, пераўтворанай у кастрыраваную гісторыю БССР.

Але праходзіць час і надыходзіць момант, калі маналіт вертыкалі хлусні асыпаецца пылам. Аднак аднаўленне праўды гісторыі, адбудова нацыянальнай канцэпцыі гісторыі патрабуе высілак, таго ж часу і мужнасці ў пераадоленні не толькі ціску старой схемы, але і ціску палітычных сіл учарашняга дня. Гэта сітуацыя беларускіх даследчыкаў мінуўшчыны. І таму выклікае асаблівую павагу зробленая імі ў справе рэканструкцыі рэальнай гісторыі Беларусі ў кантэксце гісторыі еўрапейскай і сусветнай. Анатоль Тарас зрабіў свой унёсак.

Хаця сам ён называе сваю кнігу сціпла навукова-папулярнай работай, яе значэнне цяжка пераацаніць. Акрамя разбурэння міфаў і рэканструкцыі рэальных падзей, прычын і наступстваў расійска-польскіх канфліктаў на працягу амаль трох апошніх стагоддзяў, са старонак яго даследавання з выключнай выразнасцю паўстае гістарычная драма Беларусі, што сталася разменнай манетай у супрацьстаянні паміж Усходам і Захадам. Але ж драма, адзначаная не безнадзейнасцю, а гістарычным аптымізмам: калі ў такіх варунках Беларусь вытрывала, аднавілася на мапе сусвету, то будзе жыць.

ДА ЧЫТАЧОЎ

# ПАКУТНЫ ВЕК

**Трылогія беларускага пісьменніка Васіля Якавенкі «Пакутны век», выдадзеная ў 2006 годзе ў складзе раманаў «Кабала» «Надлом» і «Гульня на згубу», знайшла сабе ўдзячных чытачоў, атрымала станоўчыя водгукі ў друку.**

Твор прасякнуты ідэяй нацыянальнага самасцвярджэння, адраджэння беларускай дзяржаўнасці і ахопліае падзеі на Беларусі і ў свеце больш, чым за сто гадоў. Гэта трылогія была названа пісьменнікам і вучоным Алегам Лойкам творам усебеларускім і ўсееўрапейскім.

Мінуў час, і аўтарам падрыхтавана да выпуску другое выданне «Пакутнага веку», якое дапоўнена новымі раздзеламі, новымі малавядомымі фактамі, паглыблена ў сутнасць эпахальных гістарычных падзей і характараў, яскравае па мове.

Не застаецца сумненняў, што твор прынясе чытачам эстэтычнае задавальненне, суперажыванне і радасць ад сустрэч з цікавымі, яркімі, каларытнымі героямі.

***P.S.: Аўтар кнігі Якавенка Васіль Цімафеевіч абвяшчае збор дабрачынных сродкаў для падтрымкі выдавецкага праекта.***

***Пры перасылцы грошай у памеры 35–40 тысяч рублёў на адрас 220116, Мінск–116, п/с 268, кожны атрымае не толькі аўтарскую ўдзячнасць, але і новую кнігу з аўтографам.***

***Калі ласка, разам ажыццявім праект!***

***Кантактны тэлефон: +37529 7767713 (МТС)***

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# НЯЎДАЧЫ АД БЯСПАМЯЦТВА

**Шаноўная рэдакцыя, паважаныя інтэлектуалы, творцы і чытачы нашай непаўторнай краіны, дазвольце мне падзяліцца з вамі сваім уражаннем ад каштоўнасці, даступнай і вам, якую мне пашчасціла зусім нядаўна набыць і спасцігнуць.**




Ёмісты фаліянт — зборнік «Нячывелле. Апавяданні, публіцыстыка, дакументы» Васіля Якавенкі, што летась выйшаў з друку, — злепак часу апошніх двух дзесяцігоддзяў, прынамсі, у грамадскім жыцці. Кніга ўразіла мяне надзвычай. У ёй бескампрамісна аналізуецца і выстройваецца ў часе двурушнае ў адносінах да нацыянальнай культуры чынавенства, але ж не яно вызначае перспектыву краіны.

Выдатны публіцыст і празаік В. Якавенка выступае і як бязлітасна праўдзівы гісторык. Ён смела даследуе супярэчнасці сучаснага адраджэнцкага руху ў Беларусі. Гэта кніга раскрывае шмат невядомага і супярэчнага з гісторыі нашага недалёкага мінулага. Рух грамадства тут імкне, як у Брэйгеля на вядомай карціне, калі сляпы вядзе невідушчых да зусім непазбежнай прорвы. Духоўны і сацыяльны вопыт сучаснасці В. Якавенка ўмела суадносіць з вопытам гісторыі.

Кожнае апавяданне ці артыкул — гэта магутны сплаў пакутнага болю ад усведамлення наканаванага і перажытага. Шмат чаго з гэтай кнігі не знойдзеш ні ў якой энцыклапедыі. Гэта непаўторны і праўдзівы летапіс. І дзівіць тое, што пры яго шматковай размаістасці, пры калейдаскапічнай стракатасці тэкстаў — тут будзённае і фантастыка, рэальнае і летуценнае, проза і паэзія — усё быццам у адзіны клубок знітавана, каб кожны, хто прачытае гэтую кнігу, быў здольны яшчэ паўней спасцігнуць і таемныя духоўныя каштоўнасці свайго і не толькі свайго народа, і небяспеку іх страты.

Трылогія «Пакутны век» і публіцыстычны зборнік «Нячывелле» — гэтыя дзве кнігі, лічу, неабходна мець у сябе кожнаму, каб чытаць і перачытваць, спасцігаючы ўсё глыбей наш нацыянальны сусвет, першародны, дадзены Богам і пакручаны, пакарабачаны шайтанам, драпежнікам, сусвет, які, спадзяюся, неўзабаве спатрэбіцца нам дзеля далейшай дабратворнай разбудовы грамадства.

**Алесь Цыркуноў, мастак**

▸ ПРАЕКТ

# УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ ПРА СУЧАСНАЕ МАСТАЦТВА, АЛЕ БАЯЛІСЯ СПЫТАЦЬ

Аляксей ХАДЫКА

**Пад гэтай правакацыйнай назвай з 20 па 22 лютага ў галерэі «Падземка» прайшлі дэманстрацыі ролікаў відэа-арта і дыскусіі гледачоў, арганізаваныя яе гаспадарамі і творцамі з an angelico group, аб'яднаныя загалоўкам «Person.Sex.Art».**


Антон Слюнчанка і Віталь Дзегцяроў

Двое маладых людзей з пакалення трыццацігадовых, Антон Слюнчанка і Віталь Дзегцяроў, адзін — з адукацыяй у гісторыі мастацтваў і мастак-партрэтыст, другі — мастак-дызайнер, прэзентавалі тры відэаролікі, якія паўсталі на мяжы відэа-арта і віджэінга. Іншымі словамі, маладыя людзі, якія пасталелі пасля знікнення з мапы свету СССР, прадстаўлялі творы, паўсталыя ў сферы культуры, невядомай у савецкія часы. І дагэтуль у нашай краіне не надта пашыранай.

Варта заўважыць, што віджэінг — гэта адносна новы від мастацтва, вынікам працы ў якім з'яўляюцца «відэаміксы» — візуальныя эфекты, што створаны ў рэальным часе пры дапамозе кампутарнага абсталявання ў выніку нарэзкі відэасюжэтаў, вобразаў і адлюстраванняў пад адпаведную музыку. Не фільм, не відэа-арт, а нешта новае, з шматпланавай вобразнасцю, увасобленай сродкамі, блізкімі генерацыі, для якой кампутар і відэакамера замянілі пэндзлі з алоўкамі.

У гэтым сэнсе паказальны досвед «культавага» рэжысёра Пітэра Грынуэя, які, звярнуўшыся да віджэінга і перформанса, адну са сваіх віджэй-работ прысвяціў пераасэнсаванню знакамітага палатна «Начны дазор» Рэмбрандта ў праекце «Начное назіранне». Такім чынам, у віджэй-праекце ёсць тэма, ёсць інструментарый культурнай спадчыны і асацыятыўны шэраг, паводле якога стваральнік новага сюжэту, сучасны мастак, прапануе гледачу адправіцца ў падарожжа на хвалях рэфлексій і эмацыйных суперажыванняў.

Зрэшты, тэмай віджэй-работы можа быць абраная і проста музыка, і тады паўстае візуальны матэрыял, прызначаны не столькі для «відэаінсталяцыі» і мэтавага сузірання, а хутчэй фонавы відэашэраг для музычнай вечарыны. Чым an angelico group таксама займаюцца, фактычна ад часу свайго нараджэння напачатку XXI стагоддзя. У такіх выпадках іх праца ўвасабляецца ў відэаімправізацыі на фоне прапанаваных клубным DJ музычных тэм, або ў загадзя падрыхтаваныя відэасюжэты, калі музычная ідэя вечарыны фармулюецца папярэдне. Апошняя можа быць звязаная з творчасцю абсалютна новых музычных калектываў або грунтавацца на матэрыяле настальгічных party, на якіх DJ прапануе, прыкладам, старыя запісы канцэртаў Black Sabbath, Deep Purple, The Who, Led Zeppelin. У досведзе an angelico group ёсць і такія работы.

Гэтым разам у «Падземцы» Антон Слюнчанка і Віталь Дзегцяроў прадставілі творы, бліжэйшыя да канцэптуальнага відэа-арта, дэкларававўшы сваёй задачай аналіз тэмаў «ню» ў мастацтве і ўзаемаадносінаў мастака і асяроддзя. Паводле тэксту буклета-анатацыі, гутарка ішла пра суадносіны дасканалай, але халадноватай, самадастатковай жаночай прыгажосці, напоўненай водгукам узнёслай вытанчанасці класічных рэнесансавых мадоннаў, — і супрацьпастаўленага ёй сучаснага дэгуманізаванага тэхналагічнага асяроддзя, дзе прыгажосці «як бы» не знаходзіцца адпаведнага месца.

Гераіні дзвюх першых 15-хвілінных стужак «Катарына» і «Юлія», узнікаючы на раздробленым у 3–4 праекцыі (як рэнесансавы алтар-рэтабла) экране, падарожнічалі на фоне прыгожых, але сумных, залітых халодным святлом краявідаў праз пустэчу восеньска-зімовых палёў, узбярэжжаў рэк і азёр, пустыннымі дарогамі ў адзіноту расфарбаваных начнымі агнямі гарадоў. Паездка — машына з гераіняй за рулём у руху — горад — танец мадэлі ва ўяўным інтэр'еры клуба. Эстэтыка кадра чымсьці нагадвала фільм «Вуліца Малхоланд» Дэвіда Лінча, перагукаючыся з ім нават тэматычна. Імкненне, палёт-паездка адзінокай жанчыны (як у фільме — у Hollywood, святы лес падманных мрояў) — у дэгуманізаваную прастору горада, які «распранае» яе, насычаецца яе аголенай, дэманстраванай у танцы прыгажосцю. Па ўспрыняцці стужкі-кліпы можна паставіць поруч з «жаночымі» палотнамі Міколы Селяшчука, такімі, як «Матылі тут не жывуць».

Цікава, што ў дыскусіі па праглядзе мастакі пачулі даволі жорсткія закіды крытыкаў, што ўказвалі на ўяўную адсутнасць філасофскай канцэптуалізацыі работ. Падаецца, аднак, гэта задача вырашалася не наратыўным падыходам, а спробай прэпаравання вобраза праз элементарныя склавыя часцінкі.

Як рэнесансавы мастак-жывапісец візуальна даследаваў свой аб'ект камерай-абскурай, выбудоўваючы яго дакладныя геаметрычныя параметры, так віджэі падступаліся да сучасных прыгажунь, спрабуючы прачытаць вобраз праз элементарныя прыёмы новага мастацтва. «Светлы» і «цёмны» час існавання чалавечай прыгажосці. Чалавек і спакойная або рухомая прырода. Палёт птушкі ў кадры і рух чалавечага цела. Колер і яго адсутнасць у кадры, прычым колер, ужываны ў час выяўлення ў чалавеку «дыянісійскага», начнога, пачуццёвага пачатку. Урэшце, нечаканае жаданне сродкамі відэа-арта паспрабаваць падступіцца да больш характэрнай для мастацтва скульптуры гульні ў фактурныя супрацьпастаўленні. Гутарка пра трэці дэманстраваны сюжэт, дзе паўаголеная эратычна-пачуццёвая натура амаль статычна супастаўляецца з прыпадобненай да белага мармуру паверхняй накінутых на яе драпіровак.

Коратка кажучы, кожнаму часу — свае сродкі выразнасці. Перадаваць словамі ўражанні ад твораў віджэінгу — хіба што марная праца. Аднак, калі раптам увечары, наведваючы музычную вечарыну, вы зразумееце, што на плазменным экране ў клубе адлюстроўваецца нешта больш змястоўнае, чымсьці ролікі Fashion TV і простыя кліпы… Калі вы адчуеце, што вас прываблівае больш складаны вобразна-асацыятыўны шэраг… Значыць, вы сутыкнуліся з працай віджэя, пакуль што адносна рэдкай з'явай у клубных мерапрыемствах Мінска.

**Імкненне, палёт-паездка адзінокай жанчыны (як у фільме — у Hollywood, святы лес падманных мрояў) — у дэгуманізаваную прастору горада, які «распранае» яе...**

▸ ТВОРЧАСЦЬ

# ВЫСТАВЫ І ПРЭЗЕНТАЦЫІ

Аляксей ХАДЫКА

**23 і 25 лютага ў Нацыянальным мастацкім музеі адчыніліся дзве новыя экспазіцыі.**

У працяг вялікага восеньскага праекта «Праваслаўная ікона Расіі, Украіны і Беларусі» і ў пачатак святочных мерапрыемстваў да 70-гадовага юбілею Музея, адчынілася выстава «Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў». Экспануецца 33 творы, якія паходзяць з храмаў розных хрысціянскіх канфесій, дэманструючы культурна-рэлігійнае багацце і разнастайнасць мастацкай спадчыны хрысціянства ў нашай краіне. Большасць твораў выстаўляецца ўпершыню, за што зацікаўлены наведвальнік мусіць выказаць удзячнасць руплівай працы рэстаўратараў. А ў сераду госці музея былі сведкамі адкрыцця выставы заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Генадзя Фёдаравіча Шутава «Прадмет. Час. Чалавек», якая прысвечана 70-годдзю з дня яго нараджэння. Творы майстра — тонкія акварэльныя работы, краявіды і нацюрморты.



Што датычыцца клубнага жыцця, то адметнай падзеяй зрабілася прэзентацыя ў рэстаране «Журавінка» праграмы «Акадэміі фанана», арабскага танца, які прапагандуе студыя прыгажосці «Шыфалі» (вул. Багдановіча, 8) пад кіраўніцтвам выдатнай танцоўшчыцы Ціны. Мінск, і гэта заканамерна, становіцца сапраўдным мегаполісам, які адчыняе свае залы і пляцоўкі для творчага ўспрыняцця мастацкіх дасягненняў розных народаў свету. Зрэшты, арабскі танец — гэта і ўвасабленне дасканаласці руху і рытму, і прыгожае відовішча, і выдатны спосаб удасканалення. Да чаго і звяртаюцца яго прапагандысты, ведучы занятркі як з ужо прафесійнымі выканаўцамі, так і з групамі пачаткоўцаў школьнага ўзросту. Нават назва «фанана», па-арабску — «акторка», у адрозненне ад «раккаса» — танцорка, сведчыць пра сур'ёзныя творчыя памкненні калектыву «Акадэміі».

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Алена Анісім
Шэф-рэдактар Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 27.02.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.